ВЫБУХ ГНЕВУ І АБУРЭНЬНЯ

Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся!

Зьвязда

Орган ЦК і Мен. Гаркому Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

Год выданьня—XV
№ 239 (4144)
ЧАЦЬВЕР 3 верасьня 1931 г.
Выходзіць БЕСЬПЕРАПЫННА.

БУРНЫЯ ДЭМАНСТРАЦЫІ ПРАТЭСТУ У БССР супроць разгулу белага тэрору

МІЛЬЕНЫ ПАТРАБУЮЦЬ

спыніць крывавыя оргіі ў засьценках белапанскай Польшчы

Будаўніцтву сацыялістычных фабрык малака і мяса—баявыя тэмпы

22 жніўня была апублікавана адозва СНК БССР і ЦК КП(б)Б аб разгортваньні сацыялістычнай жывёлагадоўлі.

Для кожнага бальшавіка павінна быць зусім яснай уся гаспадарча-палітычная важнасьць гэтага дакументу: адозва — ёсьць баявая праграма дзейнасьці для кожнай партарганізацыі, кожнага калгасу й саўгасу на 1931-32 год.

Адозва ЦК і СНК прадугледжвае далейшае павялічэньне сацыялістычнага стада, разгортваньне новых жывёлагадоўчых саўгасаў, калгасных таварных фэрм, маючы на мэце стварыць у БССР па працягу 1931-32 г. моцную мяса-малочную сацыялістычную базу.

Будаўніцтва скотных двароў, сьвінарнікаў, цялятнікаў, птушнікаў — ёсьць тое асноўнае зьвяно, у залежнасьці ад якога знаходзіцца выкананьне ўсёй вызначанай праграмы камплектаваньня стада. Без адбудовы належных памяшканьняў для стада ўсякія разважаньні аб барацьбе за сацыялістычныя фабрыкі мяса ёсьць апартунізм або глупства. Ніхто не павінен забываць пра гэта, асабліва, калі мець на ўвазе лічаныя дэкады да паступленьня халадоў.

Між тым тэмпы будаўніцтва і камплектаваньня стада **ні ў якім разе** не паказваюць на ўсьведамленьне дырэктыў, даных у адозьве, усімі ўстановамі, адказнымі за гэту справу. ЦК КП(б)Б у сваёй пастанове ад 31 жніўня аб ходзе будаўніцтва і камплектаваньня ў жывёлагадоўчых саўгасах і калгасных таварных фэрмах адзначае, што **«будаўніцтва скотных двароў, цялятнікаў, сьвінарнікаў і птушнікаў праходзіць абсалютна нездавальняюча і знаходзіцца пад яўнай пагрозай зрыву...»**

Лічбы выкананага плянавага будаўніцтва гавораць самі за сябе: 10 проц. па Сьвінаводзе і Белсельтрэсьце і 25 проц. па Сьвінакалгасцэнтры і Малакацэнтры.

Дзе прычыны такіх ганебных тэмпаў і недапушчальных адносін да важнасьці гаспадарча-палітычнага будаўніцтва?

Першая і важнейшая прычына — гэта **апартуністычная недаацэнка** будаўніцтва з боку цэнтральных і мясцовых устаноў мяса-малочнай сеткі. Да гэтага часу тут няма яшчэ адпаведнай апэрацыйнасьці, ініцыятывы і адказнасьці за посьпех будаўніцтва кожнага аб'екту. Замест гэтага пераважае безадказнасьць, пустая міжведамственая лаянка, спасыланьні на «аб'ектыўныя» ўмовы і г. д. Белсельбуд, як аспоўная ўстанова, адказная за тэрміны выкананьня пляну, не праявіў належнай гібкасьці ў сваёй рабоце.

Другая, ня менш важная прычына марудных тэмпаў ляжыць у **неарганізаванасьці рабочай сілы** і працы на будаўніцтве. Мэтады сацспаборніцтва і ўдарніцтва, даўшыя ня мала яркіх бальшавіцкіх рэкордаў, тут, на важнейшым вучастку сацыялістычнага будаўніцтва, на наш сорам, **адсутнічаюць.** Няма патрэбнай увагі да палітычнага і эканамічнага абслугоўваньня рабочых, занятых па будаўніцтве. Пры такім становішчы ўсякія спробы знайсьці прычыны зрыву плянаў «па-за намі» — ёсьць самы махровы апартунізм на практыцы. ЦК КП(б)Б сваёй пастановай ясна давёў, што цэнтральныя і мясцовыя арганізацыі, калгасы і саўгасы **далёка не скарыстоўваюць усіх мясцовых магчымасьцяй** для будаўніцтва. Напрыклад, кулявая салома і гліна, як матар'ял для стрэх, дасюль злачынна ігнараваліся. Пілы-цыркуляркі на мясцох амаль не скарыстоўваліся для падрыхтоўкі піламатар'ялаў.

Нарэшце, паказаныя вышэй два адмоўныя моманты ў будаўніцтве ў значнай меры тлумачацца невыстарчальным кіраўніцтвам і кантролем за будаўніцтвам з боку раду райкомаў КП(б)Б. ЦК падкрэсьліў гэтую недапушчальную акалічнасьць і катэгарычна прапанаваў: **пад пэрсанальную адказнасьць усіх сакратароў РК і старшынь райвыканкомаў** узяць пад неаслабны кантроль будаўніцтва ў жывёлагадоўчых саўгасах і калгасных таварных фэрмах. Дырэктыва ясная—яна патрабуе **рэальнага** выкананьня. Пастанова ЦК кладзе **канец** усякім міжведамственым разважаньням «наогул» і безадказнасьці ў галіне забесьпячэньня будаўніцтва рознымі матар'ялямі (лес, піламатар'ялы, цьвікі і інш.).

Наркамснаб, Лесаснабзбыт, Мэталяаб'яднаньне і іншыя гаспадарчыя ўстановы атрымалі цьвёрдыя тэрміны ў забесьпячэньні матар'ялямі. Яны павінны быць выкананы **ва што-б там ні стала.**

Посьпех выкананьня будаўнічых плянаў вырашаецца тым, як будуць арганізаваны рабочыя і праца. Гэта **асноўнае зьвяно,** за якое трэба зараз ухапіцца. Абвясьціць вайну прагулам, ураўнілаўцы. **За зьдзельшчыну, за сацспаборніцтва і ўдарніцтва на будаўніцтве—вось за што павінны змагацца прафсаюзы і райкомы.** Тут ляжыць той бальшавіцкі сакрэт посьпехаў, якога не разумеюць апартуністы і нашы вогарі. Цьвёрда выконваючы дырэктывы аб забесьпячэньні рабочых, аб разгортваньні прэміяваньня, узьняцьці творчай ініцыятывы рабочых,—мы можам і павінны справіцца з вызначанай праграмай будаўніцтва.

Час не чакае. Пастанова ЦК вызначае цьвёрдыя тэрміны скончэньня аб'ектаў будаўніцтва.

Цялятнікі, аборы, матачнікі для сьвіней скончыць да **15 кастрычніка,** рэшту сьвінарнікаў, птушнікаў — не пазьней **15 лістапада.**

Рэальнасьць гэтых тэрмінаў залежыць ад нас, ад бальшавіцкай мабілізаванасьці партыйных арганізацый, трэстаў, саўгасаў і калгасаў.

Толькі апартуністы могуць сумнявацца ў рэальнасьці гэтых тэрмінаў. У бальшавікоў-жа свой, ленінскі погляд на рэальнасьць.

«Рэальнасьць нашай праграмы — гэта жывыя людзі гэта мы з вамі, наша воля да працы, наша гатоўнасьць працаваць па-новаму, наша рашучасьць выканаць плян» (Сталін).

Вось гэта бальшавіцкая рашучасьць і воля павінны зябясьпечыць выкананьне пляну па стварэньні сацыялістычных фабрык мяса і малака.

Атакі фашысцкіх катаў на палітзьняволеных Серадзкай турмы

Фашысцкая адміністрацыя распачала новыя наступленьні на нашы правы. Сьвятла вечарам ужо не даюць, мелі даць дадатковую прагулку хворым таварышом, але і гэтага ня хочуць зрабіць. Бязьлітасныя адносіны адміністрацыі да нас, вечныя праваакацыі служаць довадам таго, што адміністрацыя прыступае да правядзеньня фашысцкага рэгляманту на «ўсе 100». Ад жанчын ужо адабралі бібліятэку. Цяпер распачаліся далейшыя атакі і ўжо не хацелі прыняць кніжак і газэт для нас, г. зн., што хочуць нас пазбавіць камунікацыі бібліятэкі. Рыхтуемся да абароны.

Палітзьняволеныя варшаўскай цэнтралі рыхтуюцца да адпору

Фашысцкая пракуратура і турэмная ўлада паступова праводзяць палітыку навязваньня нам умоў, на якіх сядзяць крымінальныя злачынцы, — пішуць палітзьняволеныя Варшаўскай цэнтралі: ня гледзячы на тое, што ў камэрах панае цэлы дзень паўзмрок, страшэнная духата (краты так зроблены, што не дапушчаюць паветра і сьвятла) і хоць турэмны двор малы, заўсёды дымны і акружаны з 4 бакоў пяціпавярховымі гмахамі, — адабралі ў нас адну гадзіну прагулкі штодзенна. Спачатку хацелі ў нас адабраць з належачых нам дзьвёх гадзін адну гадзіну і 45 хв. Пасьля месячнай барацьбы мы адваявалі ледзь адну гадзіну. З ПРЫЧЫНЫ НЕДАХВАТУ ПАВЕТРА НАШЫ ТАВАРЫШЫ ЧАСТА МЛЕЮЦЬ У КАМЭРАХ І ХВАРЭЮЦЬ ХРАНІЧНЫМ БОЛЕМ ГАЛАВЫ. Уступкі, здабытыя пасьля месячнай барацьбы, аказваюцца пераважна міфам. Цяпер наступілі далейшыя атакі: У НАС АДАБРАЛІ ПРАВА ДЗЯЛІЦЬ ХАРЧЫ, А НЕКАЛЬКІ ДЗЁН ПАСЬЛЯ АДАРБАЛІ АД НАС СШЫТКІ І ЦАЛКАМ ЗРЫВАЮЦЬ МАГЧЫМАСЬЦЬ НАВУЧАНЬНЯ.

ПАЛІТЗЬНЯВОЛЕНЫЯ ЦЭНТРАЛЬНАЙ ТУРМЫ Ў ВАРШАВЕ.

Дэманстрацыі пратэсту ў Бабруйску

КОЖНЫ ДЗЕНЬ ТЭЛЕГРАФ ПРЫНОСІЦЬ ВЕСТКІ АБ НОВЫХ ГАЛАДОЎКАХ ПАЛІТЗЬНЯВОЛЕНЫХ У ТУРМАХ БЕЛАПАНСКАЙ ПОЛЬШЧЫ, АБ КРЫВАВЫХ РАСПРАВАХ ТУРЭМНЫХ КАТАЎ, БЫЛЫХ ЦАРСКІХ АХРАНЬНІКАЎ — ЦЯПЕРАШНІХ ПОЛЬСКІХ ПРАКУРОРАЎ — «БЛЮСТИТЕЛЕЙ» ЦАРСКАГА КАРНАГА КОДЭКСУ Ў ПОЛЬШЧЫ.

ГЭТЫЯ КАТАВАНЬНІ І ЗЬДЗЕКІ Ў ТУРМАХ ФАШЫСЦКАЙ ПОЛЬШЧЫ ВЫКЛІКАЛІ НОВУЮ БУРУ ГНЕВУ І АБУРЭНЬНЯ ПРАЦОЎНЫХ МАС БССР. НАМІ АТРЫМАНЫ ПАВЕДАМЛЕНЬНІ АБ БУРНЫХ ДЭМАНСТРАЦЫЯХ ПРАТЭСТУ, ЯКІЯ АДБЫВАЛІСЯ 31 ЖНІЎНЯ ВА МНОГІХ ГАРАДОХ І РАЁНАХ БССР, НАПРЫКЛАД, У БАБРУЙСКУ, ПЛЕШЧАНІЦКІМ, БЯГОМЛЬСКІМ РАЁНАХ І ІНШ.

У БАБРУЙСКУ ПЕРАД ДЭМАНСТРАЦЫЯМІ АДБЫВАЛІСЯ МАСАВЫЯ МІТЫНГІ ПРАТЭСТУ НА ПРАДПРЫЕМСТВАХ У ЧАСЕ АБЕДЗЕНЫХ ПЕРАПЫНКАЎ І ПАСЬЛЯ РАБОТЫ.

А 7-АЙ ГАДЗІНЕ ВЕЧАРА ШМАТТЫСЯЧНАЯ ДЭМАНСТРАЦЫЯ НАКІРАВАЛАСЯ Ў САД БУДАЎНІКОЎ, ДЗЕ БЫЛА ЎХВАЛЕНА АДОЗВА ДА РАБОЧЫХ НЯМЕЧЧЫНЫ, АНГЛІІ І ФРАНЦЫІ. У ГЭТАЙ АДОЗЬВЕ ПРАЛЕТАРЫЯТ БАБРУЙСКУ ПІША:

— МЫ ЗВАРАЧАЕМСЯ ДА ВАС, ПРАЛЕТАРАЎ НЯМЕЧЧЫНЫ, АНГЛІІ І ФРАНЦЫІ, З ЗАКЛІКАМ, КАБ ВЫ ЎЗЬНЯЛІ СВОЙ ГОЛАС ПРАТЭСТУ СУПРОЦЬ ПАХОДУ ФАШЫСЦКАЙ ДЫКТАТУРЫ НА ФІЗЫЧНАЕ ЗНІШЧЭНЬНЕ 10 ТЫС. РЭВАЛЮЦЫЙНЫХ БАРАЦЬБІТОЎ ПОЛЬШЧЫ, ЗАХ. БЕЛАРУСІ І ЗАХ. УКРАІНЫ, СУПРОЦЬ НЯЧУВАНЫХ ЗЬДЗЕКАЎ З ПАЛІТЗЬНЯВОЛЕНЫХ.

ЗАТРЫМАЙЦЕ РУКУ КАТА, ЗАНЕСЕНУЮ НАД ЖЫЦЬЦЁМ РЭВАЛЮЦЫЙНЫХ РАБОЧЫХ!

АКАЖЭЦЕ ЎСЯМЕРНУЮ ДАПАМОГУ НАШЫМ БРАТОМ ПА КЛЯСЕ!

Абутнікі Бэрліну, выступайце на абарону палітзьняволеных Польшчы

Рабочыя і інжынэрна-тэхнічны пэрсанал менскай абутковай фабрыкі ў лісьце да абутнікаў Бэрліну пішуць:

З-за сырых сьцен фашысцкіх турэмных казэматаў, з-за мяжы жудаснай катоўні народаў — фашысцкай Польшчы даносяцца да нас стогны тысяч ахвяр капіталістычнага тэрору.

Шпаркі тэмп гаспадарчага развалу фашысцкай Польшчы ва ўмовах вялізарнага беспрацоўя выклікае абвастрэньне палітычнага крызісу польскага фашызму. Узброены напад на Савецкі Саюз, жорсткае задушэньне рэвалюцыйнага руху ў Заходняй Беларусі і Заходняй Украіне, фізычнае зьнішчэньне палітзьняволеных пры дапамозе жудасных сярэднявяковых катаваньняў — вось шлях, якім імкнецца польскі фашызм выйсьці са свайго пагібельнага становішча.

Указваючы на вялізарныя дасягненьні рабочае клясы ў пабудове сацыялізму ў СССР, менскія абутнікі зварачаюцца да абутнікаў Бэрліну з заклікам абараняць палітзьняволеных Польшчы ад тых катаваньняў і зьдзекаў, якія праводзяць над імі фашысцкія турэмныя каты.

Абутнікі з абурэньнем выказваюць свой пратэст супроць злачынных дзеяньняў польскага фашызму, бяручы на сябе абавязак узмацненьня мопраўскай дзейнасьці па фабрыцы і ліквідаваньня запазычанасьці па членскіх узносах. **Кантрольную лічбу ў 750 руб. на дапамогу палітзьняволеным абутнікі павялічылі да 1.000 руб.**

ДАРАГІЯ ТАВАРЫШЫ! Мы ведаем у якім становішчы знаходзяцца палітзьняволеныя ў турмах польскага фашызму, мы чуем вашы стогны ад зьдзекаў і катаваньняў і ў знак свайго салідарнасьці бярэм на сябе рад абавязкаў па дапамозе палітзьняволеным у зімовы час:

1. Выканаць кантрольную лічбу на дапамозе палітзьняволеным (750 руб.) а перавышэньнем да 1.000 руб. 2. Ліквідаваць запазычанасьць членскіх узносаў членамі МОПР'у. 3. Ахапіць усе 100 проц. рабочых членствам МОПР'у. 4. Падтрымліваць з вамі самую цесную сувязь.

З брацкім прывітаньнем—рабочы калектыў менскай абутковай фабрыкі.

* * *

Мітынг рабочых цукернай фабрыкі ў Магілеве кляйміць ганьбай польскіх фашыстаў і **рашуча пратэстуе супроць зьдзекаў турэмных катаў над 10.000 рэвалюцыянэраў-палоньнікаў.**

Сярэднявяковая інквізыцыя, якую польскія садысты ў барацьбе з рэвалюцыйным рухам апярэдзілі ва ўсіх адносінах, зьяўляецца **лепшым доказам шалёнай падрыхтоўкі польскім фашызмам інтэрвэнцыі супроць СССР.**

Рабочыя і працоўнае сялянства Польшчы, Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны, памятайце, што мы—рабочыя Савецкага Саюзу—з посьпехам будуючы сацыялізм не забываем пра братоў, якія вядуць за чырвоным кардонам гераічную барацьбу за справу сусьветнай рэвалюцыі. У кожны момант мы акажам вам як маральную, так і матар'яльную дапамогу. У адказ на зьверствы фашызму мы абавязваемся **ўзьняць яшчэ вышэй тэмпы сацыялістычнага будаўніцтва.** У знак салідарнасьці з вамі мітынг рабочых пастанаўляе **1 проц. месячнай зарплаты адлічыць у фонд МОПР'у,** як матар'яльную дапамогу палітзьняволеным Польшчы.

* * *

Агульны сход курсантаў шасьцімесячных курсаў НКФ БССР пры Лепельскім **райфа** з абурэньнем пратэстуе супроць зьдзекаў фашысцкіх катаў над палітзьняволенымі Польшчы.

Курсанты абавязваюцца **ўзмацніць работу ячэйкі МОПР'у і весьці штодзенную інтэрнацыянальную работу сярод працоўнага сялянства, уносячы адначасова 48 руб., як дапамогу палітзьняволеным Польшчы.**

РЭАЛІЗУЕМ АДОЗВУ ЦК І СНК АБ ЖЫВЁЛАГАДОЎЛІ

Даволі ігнараваць гліну і салому

У дзьве дэкады накрыць стрэхамі пабудаваныя сьвінарнікі і аборы

ДЫРЭКТАРЫ САЎГАСАЎ АДКАЗВАЮЦЬ ЗА ХОД БУДАЎНІЦТВА НАРОЎНІ З БУДАЎНІЧЫМІ ВУЧАСТКАМІ

СКАРЫСТАЦЬ УЛАСНЫЯ РЭСУРСЫ

Цыркуляркі і гантарэзкі—на поўны ход

Выкананьне праграмы сацыялістычнай жывёлагадоўлі ў 1931 г. і тэмпы яе далейшага разьвіцьця перш за ўсё будуць залежаць ад таго, як справяцца нашы саўгасы і калгасныя таварныя жывёлагадоўчыя фэрмы з падыходзячай зімой, наколькі яны забясьпечаць стада патрэбнымі памяшканьнямі.

На нарадзе па пытаньнях **будаўніцтва ў жывёлагадоўчых саўгасах** пры рэдакцыі **«Зьвязда»,** па якой прысутнічалі прадстаўнікі **Белсельбуду, Белсаўгастрэсту, Сьвінаводу, Лесбелу і Белмэталяаб'яднаньня** выявілася, што тэмпы будаўніцтва застаюцца недапушчальна марудныміі.

З заявы дырэктара Белсельбуду тав. **СЬЛІЎКІНА** можна зрабіць вывад, што пачатае будаўніцтва 510 сьвінарнікаў у саўгасах Сьвінаводу зараз нельга скончыць з-за недахвату піламатар'ялаў і цьвікоў.

Але аб адным тав. Сьліўкін змаўчаў на нарадзе — аб тым, што Белсельбудам было зроблена для скарыстаньня і поўнай нагрузкі тых пілаўстановак, якія ёсьць у саўгасах.

Аказваецца, ні **СЬВІНАВОД,** ні **БЕЛСЕЛЬБУД** на сёньняшні дзень **НЯ ВЕДАЮЦЬ, КОЛЬКІ Ў САПРАЎДНАСЬЦІ ПІЛАЎСТАНОВАК ЁСЬЦЬ У САЎГАСАХ,** ніякага ўліку іх дагэтуль не вялося.

Паводле папярэдніх няпоўных вестак у саўгасах Сьвінаводу ёсьць 50 цыркулярак і 36 гантарэзак. Але, падкрэсьліваем, гэта ня поўныя весткі. **Большасьць гэтых пілаўстановак зусім не нагружана.**

Замест таго, каб арганізаваць расьпілоўку матар'ялаў у кожным саўгасе, дзе гэта толькі магчыма, Белсельбуд да апошняга часу **спадзяваўся на тое, што яму ўсё адпусьціць Лесбел.** Вельмі мала было зроблена для таго, **КАБ МАБІЛІЗАВАЦЬ СВАЕ ЎЛАСНЫЯ РЭСУРСЫ.**

У выніку такой безадказнасьці зараз стварылася такое становішча, што далейшае будаўніцтва запягваецца з-за адсутнасьці піламатар'ялаў. **Гэта ў той час, калі Белсельбуд мог напілаваць у саўгасах каля 50 тыс. кубамэтраў піламатар'ялаў.** Напрыклад, у саўгасе **«ІВАНЬ»** і іншых саўгасах **Слуцкага раёну цыркуляркі зусім не нагружаны.** Гэтыя саўгасы маглі-б забясьпечыць піламатар'ялямі **НЯ ТОЛЬКІ СЯБЕ,** але і рад іншых саўгасаў. Дрэваапрацоўчы завод мясцовага значэньня ў Слуцку таксама не нагружан.

Рад саўгасаў і будаўнічых вучасткаў зусім ігнаруюць мясцовыя будаўнічыя дахавыя матар'ялы, **ЯК САЛОМУ І ГЛІНУ.** У саўгасе **«ВІШНЁЎКА»,** напрыклад, паўтара дзесятка будынкаў ужо выведзены над дах, але як дырэктар саўгасу, так і начальнік будаўнічага вучастку **СЯДЗЯЦЬ І ЧАКАЮЦЬ ЦЬВІКОЎ** і нічога ня робяць, каб скончыць будаўніцтва, **каб падрыхтаваць салому ў бліжэйшых вёсках і калгасах.**

Дырэктар саўгасу **«ЗАРА ЗАХАДУ»** тав. **Гарбуз** выступае з такімі заявамі:

«Я не дапушчу крыць сьвінарнікі саломай».

Такія-ж апартуністычныя адносіны да мясцовых будаўнічых матар'ялаў мы наглядаем і ў радзе іншых саўгасаў.

Зразумела, такога становішча далей цярпець нельга. Трэба з усёй рашучасьцю разьбіць гэтыя апартуністычныя адносіны да такіх мясцовых будаўнічых матар'ялаў, як салома і гліна.

Прыклад саўгасу **«САМАТЭВІЧЫ»,** Касьцюковіцкага раёну, **ЯКІ ПАКРЫЎ СЬВІНАРНІКІ ДОБРЫМІ САЛОМЕННА-ГЛІНЯНЫМІ СТРЭХАМІ,** трэба зараз **безадкладна пашырыць на ўсе жывёлагадоўчыя саўгасы.**

Перад жывёлагадоўчымі саўгасамі зараз паўстае адказнейшая задача — **У 2 ДЭКАДЫ ПАКРЫЦЬ ВА ШТО-Б ТАМ НІ СТАЛА ПАБУДАВАНЫЯ БУДЫНКІ, СКАРЫСТОЎВАЮЧЫ ДЛЯ ГЭТАГА ЎСЕ НАЯЎНЫЯ МЯСЦОВЫЯ БУДАЎНІЧЫЯ МАТАР'ЯЛЫ.**

За апошнія тыдні мы мелі рад фактаў, калі дырэктары саўгасаў адмаўліліся выконваць заключаныя імі дагаворы аб падвозцы лесаматар'ялаў на будаўніцтва.

Такія адносіны да будаўніцтва з боку дырэктароў далей ня могуць быць цярпімы.

ДЫРЭКТАРЫ САЎГАСАЎ ПАВІННЫ АДКАЗВАЦЬ ЗА ХОД БУДАЎНІЦТВА НАРОЎНІ З НАЧАЛЬНІКАМІ БУДАЎНІЧЫХ ВУЧАСТКАЎ.

З боку раённых партыйных арганізацый дагэтуль пытаньнем будаўніцтва ў жывёлагадоўчых саўгасах і калгасах аддавалася зусім мала ўвагі. Раённыя арганізацыі павінны арганізаваць штодзенны нагляд і кантроль за ходам будаўніцтва. Трэба дапамагчы саўгасам выканаць пастаўленыя перад імі задачы.

МЭТАДЫ КІРАЎНІЦТВА ЯШЧЭ НЯ ЗЬМЕНЕНЫ

Адозва ЦК УсеКП(б) і СНК СССР аб разгортваньні сацыялістычнай жывёлагадоўлі была апублікавана 2-га жніўня. З таго часу ўжо прайшоў месяц—тэрмін зусім выстарчальны для таго, каб зрабіць папярэднія вынікі аб ходзе рэалізацыі гэтай адозвы.

Папярэдняе азнаямленьне з ходам камплектаваньня і будаўніцтва ў жывёлагадоўчых саўгасах і калгасах паказвае, што БССР значна адстала па гэтых паказальніках.

Такое становішча вымагае ад гаспадарча-каапэрацыйных і зямельных арганізацый карэннай перабудовы сваёй работы ў адпаведнасьці з дырэктывамі партыі і ўраду. У сапраўднасьці-ж мы яшчэ гэтага ня маем. Мэтады кіраўніцтва ўсё яшчэ застаюцца старымі. Пляны ва ўсіх арганізацыях усё яшчэ застаюцца гадавымі, квартальнымі, у лепшым выпадку месячнымі.

Улік і справаздачнасьць зусім не наладжаны, у выніку саўгасныя трэсты і калгасныя цэнтры ня маюць пэўных даных аб ходзе камплектаваньня і будаўніцтва ў гаспадарках.

Грамадзкасьць гэтых арганізацый свае часова ня была мабілізавана вакол задач, высунутых адозвай ЦК і СНК. Больш таго, **у радзе арганізацый адозва нават не драпрацоўвалася шырокай грамадзкасьцю, а там, дзе гэта рабілася, гэта насіла агульны, неканкрэтны характар.**

Аб адсутнасьці пералому ў рабоце беларускіх жывёлагадоўчых арганізацый гаворыць рад фактаў. Так, тры саўгасы Маслатрэсту павінны былі ў другім і трэцім квартале атрымаць ад Белмяса 1.000 штук буйной рагатай жывёлы. А 70 саўгасаў Сьвінаводу на працягу ўсяго году павінны атрымаць 560 штук. Першыя свой плян камплектаваньня ўжо выканалі, а апошнія на працягу ўсяго часу не атрымалі ніводнай штукі.

Пасьпяховы ход камплектаваньня ў саўгасах Маслатрэсту не гаворыць аб тым, што Маслатрэст сапраўды па-баявому мабілізаваў свой апарат вакол выкананьня адозвы ЦК і СНК. Беларуская кантора Маслатрэсту, якая кіруе ўсяго 3 саўгасамі, **ня ведае, як яны выконваюць свае гаспадарчыя пляны.**

Асабліва адчуваецца адсутнасьць апэрацыйнага і выразнага кіраўніцтва ў галіне будаўніцтва. На 1-га жніўня плян будаўнінтва па Белсельбудзе выкананы **на 27,5 проц., з якіх 17,7 проц.** прыпадае на чэрвень і ліпень месяцы. Процант выкананьня будаўнічага пляну ў веснавыя месяцы быў **вельмі нізкі,** ня гледзячы на тое, **што будаўнічымі матар'ялямі Белсельбуд у тыя месяцы быў забясьпечан у выстарчальнай колькасьці, рабочай сілай у красавіку і маі Белсельбуд быў забясьпечан на 40 проц.**

Зараз паглядзім, як выконваецца дырэктыва аб чарговасьці будаўніцтва. З агульнай колькасьці ў 2.598 аб'ектаў Белсельбуд адразу пачаў будаваць 1.290—50 проц. **Закончана-ж на 1-га жніўня толькі 246 аб'ектаў—19 проц.,** прычым аб'ектаў першачарговага будаўніцтва закончана **на 17 проц.,** а аб'ектаў будаўніцтва другой і трэцяй чаргі—**на 24 проц.** Будаўніцтва аб'ектаў другой і трэцяй чаргі за кошт першачарговага мела фарсаваны характар. Так, у чэрвені першачарговае будаўніцтва было закончана **на 4 проц.,** а будаўніцтва другой і трэцяй чаргі—**на 12 проц.,** у ліпені адпаведна 7 проц. і 7 проц.

Ня будзем больш пералічваць фактаў слабай апэрацыйнасьці ў рабоце кіруючых рэспубліканскіх жывёлагадоўчых арганізацый. Скажам проста, усе гэтыя арганізацыі павінны безадкладна перабудаваць сваю работу так, каб у цэнтры ўвагі як гаспадарнікаў, так і грамадзкасьці стаяла 100 процантнае выкананьне адозвы партыі і ўраду аб разгортваньні сацыялістычнай жывёлагадоўлі.

Брыгада ЦК УсеКП(б) і Наркамзему СССР: БУХМАН і БЕЛАВУСАЎ.

Чаму цесьляры пакінулі камуну „Чырвоны Маяк"

Будаўніцтва сьвінарнікаў у камуне «Чырвоны маяк» (Маянчанскі сельсавет, Сеньненскага раёну) сарвана па віне **старшыні праўленьня БЕЛЯКОВА.**

У камуну была прыслана брыгада ціпаўцаў (цесьляроў) для пабудовы сьвінарніка, але брыгада праз два дні вымушана была выехаць, бо ёй не давалі есьці. Старшыня камуны кажа: «сабе хлеба не хапае».

Такі ўчынак старшыні мяжуе са шкодніцтвам.

Пастановай прэзыдыуму Сеньненскай РСІ Белякоў яшчэ 3 месяцы назад выключан з партыі і павінен быць зьнят з работы, але благадушныя прымірэнцы з райкалгассаюзу яшчэ ня справіліся рэалізаваць гэту пастанову.

ФРАДЗІН.

5-га ВЕРАСЬНЯ—АПОШНІ ТЭРМІН цераблення ільну

КАЛГАСЫ „КАМУНАР" І „ЮНЫ КАМУНАР" ЧАВУСКАГА РАЁНУ ПРЭМІЮЮЦЦА ЗА ДАТЭРМІНОВУЮ ЎБОРКУ ІЛЬНУ

Па прыкладзе перадавікоў калгасы і раёны павінны скончыць уборку ў тэрмін і разгарнуць першапачатковую апрацоўку

Растуць рады пераможцаў на фронце ільнаўборкі

Пастанова праўленьня Калгасцэнтру БССР

Адзначыць, што калгасы «ЮНЫ КАМУНАР», Благаўскага сельсавету, і «КАМУНАР», Валкавіцкага сельсавету, Чавускага раёну, датэрмінова скончылі ўборку ільну. Калгас «Юны камунар» скончыў уборку на плошчы 40 гэкт. 14-га жніўня, а калгас «Камунар» — 65 гэкт. 15-га жніўня.

За датэрміновую ўборку ільну калгасамі «Юны камунар» і «Камунар», якія ўсю працу правялі на аснове зьдзельшчыны і разгарнулі апрацоўку ільну па канаэрнай сыстэме, а таксама правільна наладзілі ўлік працы, выдаць прэміі старшыням калгасаў: «Юны камунар» — 100 руб. і «Камунар» — 100 руб.

Выдаць праўленьням калгасаў «Юны камунар» і «Камунар» па 200 руб. для прэміяваньня брыгадзіраў і ўдарнікаў-калгасьнікаў, якія лепш праявілі сябе ў часе ўборкі ільну.

Старшыня праўленьня Калгасцэнтру БССР МІЦЬКОЎ.

У Капыльшчыне ўхіляюцца ад апрацоўкі ільну

У КАПЫЛЬ. Па Капыльскім раёне ўборка ільну праходзіць яўна нездавальняючымі тэмпамі. Ніякіх крокаў да падвышэньня тэмпаў ня прымаецца. Між тым тэрміны ўборкі ільну праходзяць, і некаторая частка ільну можа перасьпець, што адаб'ецца на якасьці валакна.

На ўборцы ільну не выкарыстоўваецца сіла падлеткаў і мужчын.

Нічога ня робіцца па падрыхтоўцы сьцепішчаў і мачыльных ям. Некаторыя калгасы спадзяюцца, што здадуць дзярнавае лён без апрацоўкі.

Кіруючыя арганізацыі раёну павінны забясьпечыць баявы тэмп скончэньня ўборкі ільну. Надбайнасьці і апартуністычнаму самацёку тут трэба палажыць канец.

Брыгадзір «Зьвязды» АН. ШУСТРЫ.

30 проц. перасьпелай пасконі ня ўбіраецца

ГОРКІ. Ня гледзячы на сыгналы «Зьвязды», уборка ільну па Горацкім раёне ідзе марудна. На 25-га жніўня выцераблена 4.008 гэкт., а па пляне трэба ўбраць 8.064 гэкт. Выцераблены лён стаіць на полі і не апрацоўваецца. Гарадзецкі сельсавет выцерабіў толькі 14,2 проц., а Шарынскі—17,3 проц.

У Гарадзецкім сельсавеце засеяна 935 гэкт. канапель. Аб уборцы канапель у раёне ня думаюць. Цераблеьне пасконьняў таксама ідзе слаба. На 25-га жніўня выцераблена толькі 70 проц., або 635 гэкт. пасеву канапель. Пасконьне перасьпела, ураджай гіне. Перасьпявае і лён.

Тэмпы ўборкі слабыя. Цераблеьне і апрацоўку ільну трэба скончыць у найкарацейшы тэрмін.

Брыгадзір «Зьвязды» ШАЎЦОЎ.

Лён убраны і абмалочаны

ДУБРОЎНА. Калгасы ІМЯ 12-ЦІГОДЗЬДЗЯ КАСТРЫЧНІЦКАЙ РЭВАЦЫІ і «Краснабель», Верацейскага сельсавету, скончылі ўборку ільну і адначасова скончылі малацьбу. Прыступілі да далейшай апрацоўкі ільну.

ЧАРНЯЎСКІ.

П. ПОСТЫШАУ

ЧАРГОВЫЯ ЗАДАЧЫ МАРКСЫЦКА-ЛЕНІНСКАГА ВЫХАВАНЬНЯ

(Прамова на нарадзе культпропаў пры ЦК УсеКП(б)

Таварышы! Цэнтральны Камітэт склікаў вас для таго, каб абмеркаваць і разам з вамі вызначыць чарговыя задачы марксыцка-ленінскага выхаванья. Бальшавікі ніколі не адрывалі задачы тэарытычнай работы ід марксыцка-ленінскага выхаваньня ад чарговых задач рэвалюцыйнай практыкі. Таксама як партыя змагаецца супроць дзяцінства і недасведчанай ролі тэорыі, таксама яна заўсёды і нязменна змагалася і змагаецца супроць самазамыканьня тэорыі, супроць сектарыстыкі адрыву задач марксыцка-ленінскага выхаваньня ад рэвалюцыйнай барацьбы пралетарыяту. У тым і сіла марксыцка-ленінскага выхаваньня, што яно будуецца на ўзаемным узбагачэньні тэорыі і рэвалюцыйнай практыкі для пасьпяховай барацьбы пралетарыяту за пабудаваньне новага грамадзкага ладу.

Таму чарговыя задачы марксыцка-ленінскага выхаваньня на сучасным этапе мы можам правільна вызначыць толькі ў тым выпадку, калі мы будзем выходзіць пры гэтым з асаблівасьцяй сучаснага этапу рэвалюцыі, з сацыяльна-эканамічных зрухаў, якія адбыліся і адбываюцца ў краіне, з чарговых задач барацьбы за сацыялізм.

Рашаючая задача—ліквідацыя тэхніка-эканамічнай адсталасьці нашай краіны

На аснове ажыцьцяўленьня генэральнай лініі партыя дасягнула значных посьпехаў у справе індустрыялізацыі краіны, мы змаглі дабіцца павароту серадняка ў бок сацыялізму і з посьпехам пераводзім сельска-гаспадарчую базу нашай народнай гаспадаркі з рэек дробнабуржуазнай, мізэрнай гаспадаркі на рейкі буйной, мэханізаванай сацыялістычнай гаспадаркі. Мы напасьлі рад руйнавальных удараў клясавому ворагу ў краіне, разграміўшы асноўныя яго атрады. Мы сканцэнтравалі ў руках сацыялістычнага сэктару рашаючыя вагары ўзьдзейнасьці на ўсю народную гаспадарку.

Гэтых рашаючых посьпехаў сацыялістычнага будаўніцтва партыя дабілася ў жорсткай барацьбе з «левымі» і адкрыта-правымі апартуністамі, якія прабавалі сарваць генэральную лінію партыі, перашкаджалі пасьпяховаму разгортваньню сацыялістычнага будаўніцтва.

Пад умелым і цьвёрдым кіраўніцтвам партыі, у рэзультаце наўхільнага ажыцьцяўленьня яе генэральнай лініі, СССР уступіў у перыяд сацыялізму, выпрацаваны на шырокі шлях разгорнутага сацыялістычнага будаўніцтва.

Асноўнай, рашаючай задачай, якая стаіць зараз перад намі, зьяўляецца хутчэйшая ліквідацыя тэхніка-эканамічнай адсталасьці нашай краіны, ажыцьцяўленьне ў мінімальны гістарычны тэрмін задачы «дагнаць і перагнаць» у тэхніка-эканамічных адносінах перадавых капіталістычных краін. Гэты лёзунг, які дан Уладзімерам Ільлічом, і які ўсе гэтыя гады ажыцьцяўляўся партыяй, высоўваецца зараз на першы плян, патрабуючы найвялікшага росту прадукцыйнасьці працы ва ўсіх галінах народнай гаспадаркі. Нам неабходна цяпер дабіцца максымальнага паскарэньня працэсу ліквідацыі нашай тэхніка-эканамічнай адсталасьці. Гэта дыктуецца як задачай разгорнутага будаўніцтва сацыялізму, так і міжнароднай абстаноўкай. Гэтага вымагаюць ад нас нашы абавязацельствы перад міжнародным пралетарыятам, ударнай брыгадай якога мы зьяўляемся. Бо, ліквідуючы нашу тэхніка-эканамічную адсталасьць, мы робім тым самым справу міжнароднага пралетарыяту, мы паблізкаем сусьветную пралетарскую рэвалюцыю. «Максымум у дзесяць год», — гаварыў тав. Сталін, — «мы павінны працягчы тую адлегласьць, на якую мы адталі ад перадавых краін капіталізму».

Мы маем усё неабходнае для таго, каб гэту задачу найвялікшай гістарычнай значнасьці вырашыць у паказаны тав. Сталіным тэрмін. Дасягнутыя посьпехі індустрыялізацыі і калектывізацыі, уступленьне ў строй соцень новых гігантаў прамысловасьці, пашырэньне энэрга-тэхнічнай базы ўсёй народнай гаспадаркі, уцягненьне ў эксплёатацыю ўсё новых і новых прыродных багацьцяў краіны, бязупыннае нарастаньне працоўнага ўздыму ў радох рабочай клясы і шырокіх працоўных мас, — усё гэта гіганцкі павялічвае магчымасьці росту прадукцыйнасьці працы, пашырэньня базы сацыялістычнага накапленьня, паскарэньня працэсу ліквідацыі нашай тэхніка-эканамічнай адсталасьці.

Да таго-ж неабходна мець на ўвазе і тое, што рост сацыялізму ў нашай краіне адбываецца на фоне загвалтаваньня капіталізму, на фоне сусьветнага эканамічнага крызісу, які ўсё больш абвастраецца і паглыбляецца.

Магчымасьцяй для ажыцьцяўленьня ў паказаны тав. Сталіным тэрмін задачы «дагнаць і перагнаць» у нас даволі. Але, каб выкарыстаць гэтыя магчымасьці ў поўнай меры і з найбольшай эфэктнасьцю, нам неабходна падняцца на больш высокую ступень арганізацыі, кіраўніцтва, кіраваньня. На 1-й усесаюзнай нарадзе работнікаў прамысловасьці тав. Сталін гаварыў: «Ці ёсьць у нас правільнае кіраўніцтва фабрыкамі, канальнямі? Ці ўсё тут добра? На жаль, ня ўсё тут добра. І, як бальшавікі, мы павінны гэта сказаць проста і адкрыта». Іменна ў гэтых недахопах арганізацыі вытворчасьці і кіраўніцтва прадпрыемствамі тав. Сталін бачыў асноўную прычыну таго, што мы ня ў поўнай меры выкарыстоўваем усе магчымасьці далейшага ўздыму прадукцыйнасьці працы, далейшага паскарэньня тэмпаў будаўніцтва сацыялізму.

Уступленьне СССР у перыяд сацыялізму патрабуе ад нас — партыі, кіруючай мільёнамі пралетараў і працоўных, значнага паляпшэньня арганізацыі мас у барацьбе за сацыялізм, канкрэтызацыі кіраўніцтва імі, правільнай расстаноўкі і выкарыстаньня прадукцыйных сіл краіны, умелага кіраўніцтва народнай гаспадаркай з мінімумам непрадукцыйных затрат. У гэтым зараз цэнтральная задача. На-за яе вырашэньня немагчыма рацыянальнае скарыстаньне нашых багацейшых магчымасьцяй для хутчэйшай ліквідацыі тэхніка - эканамічнай адсталасьці СССР, для далейшага пасьпяховага разгортваньня будаўніцтва сацыялізму.

Партыя правяла за апошні час рад мерапрыемстваў, накіраных на паляпшэньне арганізацыі, кіраваньня і кіраўніцтва на розных вучастках сацыялістычнага будаўніцтва. Такавы мерапрыемствы партыі ў галіне ўкараненьня гаспадарчага разрахунку і кантролю рублём, перабудовы сыстэмы і мэтадаў работы спажывецкай кааперацыі, укараненьня зьдзельшчыны ў калгасах, перабудовы сыстэмы арганізацыі і аплаты працы ў прамысловасьці, разбуйненьня прамысловых аб'яднаньняў і збожжатрэсту і інш.

У чым асноўная ідэя ўсіх гэтых мерапрыемстваў?

Мы вырашылі праблему «хто каго» ў прамысловасьці канчаткова і беспаваротна на карысьць сацыялізму. Але разам з тым мы яшчэ далёка не ў выстарчальнай ступені аўладалі справай арганізацыі працы, кіраўніцтва прадпрыемствам на аснове гаспадарчага разрахунку, выкарыстаньня ўсіх рэсурсаў прадпрыемства для павышэньня прадукцыйнасьці працы. Таму партыя патрабуе зараз ад камуністаў пагыблянцца ў дэталі даручанай справы, аўладаць тэхнікай, навучыцца кіраваць на аснове адзінаначальня і гаспадарча разьлічваць свае рэсурсы на аснове жорсткага кантроля рублём.

Мы выцясьнілі амаль канчаткова нэпмана з тавараабароту. Але мы не ў выстарчальнай ступені аўладалі савецкім каапэрацыйным гандлем, мы яшчэ не навучыліся, як належыць, абслугоўваць спажыўца. Таму партыя патрабуе ад камуністаў аўладаньня мэтадамі сапраўды савецкага каапэрацыйнага гандлю з тым, каб выгрувазочы «нэпманскі дух» з работы спажыўкаапэрацыі, прывесьці абслугоўваньне спажыўца ў адпаведнасьць з узрастаючымі запатрабаваньнямі рабочых і працоўных мас.

Мы ўцягнулі ў калгасы да 15 мільёнаў бядняцка-серадняцкіх гаспадарак. Але і ў гэтай галіне народнай гаспадаркі ў нас пакуль яшчэ нямала недахопаў у справе расстаноўкі людзей і маханізмаў, у справе скарыстаньня наяўных рэсурсаў. Таму партыя і тут патрабуе павароту поўным тварам да пытаньняў укараненьня выдзельшчыны, пастаўноўкі ўліку, канкрэтызацыі і паляпшэньня кіраўніцтва.

Мерапрыемствы, якія зараз праводзяцца партыяй у розных галінах сацыялістычнага будаўніцтва, маюць у выніку адну і тую-ж мэту: падняць на нязьмерна больш высокую ступень якасьць арганізацыі мас, канкрэтызаваць кіраўніцтва імі, паляпшыць сыстэму і мэтады кіраўніцтва, скарыстаць усе перавагі савецкага ладу, усе навыкі матар'яльныя і сацыяльныя магчымасьці для таго, каб, фарсуючы разгорнутае наступленьне сацыялізму, дабіваючы клясавага ворага, рушыць шпаркімі тэмпамі па шляху хутчэйшай ліквідацыі нашай тэхніка-эканамічнай адсталасьці.

Вось гэта цэнтральная задача і павінна легчы ў аснову вызначаных чарговых задач марксыцка-ленінскага выхаваньня. На гэтай цэнтральнай задачы трэба выхоўваць цяпер бальшавікоў, узьнімаючы іх да ўзроўню разуменьня складацейшых праблем марксызму-ленінізму. «Быць камуністам», — гаварыў ня раз тав. Ленін, «гэта значыць даваць прыклад выхаваньня і дысцыпліны». Для таго, каб весьці за сабой масы ў гэтых новых ускладненых умовах, камуністам неабходна падняцца на больш высокую тэарытычную ступень, бо іменна тэорыя, якая складваецца ў непарыўнай сувязі з рэвалюцыйнай практыкай, «дае руху ўпэўненасьць, сілу арыентоўкі і разуменьне ўнутранай сувязі акружаючых падзей» (Сталін»).

Нам неабходна ўзброіць кожнага камуніста разуменьнем асаблівасьцяй і значэньня сучаснага этапу барацьбы за сацыялізм, для ўзначаленьня мас, для пасьпяховага кіраўніцтва імі ў барацьбе за хутчэйшую ліквідацыю нашай тэхніка-эканамічнай адсталасьці. Такі стрыжань марксыцка-ленінскага выхаваньня на сучасным этапе. Ім неабходна пранізаць увесь зьмест марксыцка-ленінскага выхаваньня, выкоўваючы ў членаў бальшавіцкай партыі высокі тэарытычны ўзровень, ідэйную стойкасьць, умень не кіраваць масамі ў новых умовах.

Новая абстаноўка—новыя задачы марксыцка-ленінскага выхаваньня

У новай абстаноўцы, у новых умовах выходзіцца цяпер партыі вырашаць задачу марксыцка-ленінскага выхаваньня сваіх радоў. Якія асноўныя рысы гэтай новай абстаноўкі і якія новыя задачы выцякаюць адсюль для нашай работы ў галіне марксыцка-ленінскага выхаваньня? На гэтым даводзьце спыніцца некалькі больш падрабязна.

Неабходна ў першую чаргу ўлічыць зрухі, якія адбыліся і яшчэ адбываюцца ў рабочай клясе СССР. На аснове пасьпяховага ажыцьцяўленьня генэральнай лініі партыя поўнасьцю ліквідавала беспрацоўе, дабілася значнага павялічэньня ліку рабочай клясы.

Побач з гэтым у рабочай клясе адбыліся і значныя якасныя зрухі. Рэзка змяніўся і ўзросны склад рабочай клясы. Даволі, напрыклад, сказаць, што рыток у каменавугальную прамысловасьць Данбасу за 1930 г. налічвае ў сваім складзе 76 проц. рабочых ва ўзросьце да 22 год. Характэрны таксама і гэтых адносінах крыніцы камплектаваньня новых прамысловых кадраў. Так, аводле перапісу гарнякоў Данбасу, у рытоку за 1930 г. 17,8 проц. выхадцаў з рабочых сем'яў, 79,4 проц. выхадцаў з сялян, 1,5 проц. служачых, 1,1 самаўчыкаў і 0,1 проц. гандляроў і інш.

Аб чым гаворыць гэтый лічбы? Яны гавораць аб тым, што кадры старых рабочых, якія маюць за сваёй сьпіной тры рэвалюцыі, нага ў нагу з партыяй білі за ленінізм супроць трацкізму і правых, зьмяншаюцца ў сваёй удзельнай вазе. Іх робіцца ўсё менш і ў абсалютных лічбах: шмат выбыла са строю, многа ўшлі ў паралку вылучэньня на розныя кіруючыя работы. Тыя-ж, якія працуюць на вытворчасьці, зьяўляюцца асьцяком, асноўным ядром нашае рабочае клясы. Але іх, паўтараю, нямнога робіцца ўсё менш.

Побач з гэтым за апошнія гады ў склад рабочай клясы ўліліся і ўлітаюцца значныя кадры моладзі, непрайшоўшай школу капіталістычнай фабрыкі, школу грамадзянскай вайны. Гэты маладзяк нярэдка нясе з сабой навыкі, погляды тэндэнцыі, уласьцівыя дробнабуржуазнаму акружэньню пралетарыяту.

Іменна гэты тып рабочага будзе расьці ў сваёй удзельнай вазе ў складзе рабочай клясы. Іменна гэтыя масы прыйдзецца нам у далейшым арганізоўваць, і кіраваць у барацьбе за сацыялізм. З іх нам прыдзецца адбіраць і ўцягваць новыя і новыя тысячы ў партыю. Іменна гэты чалавечы матар'ял нам дан. І мы павінны выхаваць з яго стойкіх, адданых справе сацыялістычнага будаўніцтва пралетараў. Гэта задача, якая вымагае ліквідацыі ў ўпартай работы, але якая ў пачатковай ступені палягчаецца тым, што мо сацыялістычнае будаўніцтва ва сёй яго канкрэтнасьці і шматскладасьці зьяўляецца лепшай школай барацьбы за сацыялізм. Таму пытаньне аб якасьці работы прафсаюзаў і партыйных арганізацый сярод шырокіх беспартыйных мас, пытаньне аб пралетарскім выхаваньні новых кадраў рабочай клясы паўстае зараз з асаблівай вострасьцю.

Для таго, каб забясьпечыць пралетарскае выхаваньне маладняка рабочай клясы, неабходна перш за ўсё ва ўсю шырыню паставіць пытаньне аб марксыцка-ленінскім выхаваньні членаў нашай партыі. Нам неабходна, каб нізавая партыйная арганізацыя была даволі ідэйна стойкая і палітычна падкаваная, каб яна была ў стане ўплываць на гэтыя новыя пласты, кіраваць імі, выхоўваць іх у духу разуменьня сусьвета-гістарычнага значэньня сацыялістычнай будоўлі ў СССР, у духу пралетарскай ідэалёгіі. Ставячы пытаньне аб задачах марксыцка-ленінскага выхаваньня на даным этапе, мы ніяк ня можам ігнараваць гэтыя колькасныя і якасныя зрухі ў рабочай клясе і задачы, якія адсюль выцякаюць.

Гаворачы аб новай абстаноўцы ў справе разгортваньня марксыцка-ленінскага выхаваньня, мы таксама ня можам ігнараваць зьмен у складзе нашай партыі, якія адбыліся і адбываюцца зараз. Відавочныя ўсім і кожнаму посьпехі генэральнай лініі, усё большае ўмацаваньне СССР на фоне сусьветнага эканамічнага крызісу выклікаюць яшчэ больш рост давер'я да партыі з боку шырокіх рабочых і працоўных мас, рэзультатам чаго зьяўляецца той масавы прыліў у партыю, сьведкамі якога мы зараз зьяўляемся.

Мы можам налічваць у асноўным тры парыяды масавага прыліву ў нашу партыю за гады мірнага сацыялістычнага будаўніцтва.

Першы перыяд зьвязан са сьмерцю Леніна, калі лепшыя, кадравыя пралетары, імкнучыся ўмацаваць сваю партыю, запоўніць шчыліну, створаную сьмерцю Ільліча, пашлі тысячамі ў партыю, даўшы значную пралетарызацыю яе радоў. У гэты ленінскі набор у партыю ішлі асноўныя кадры рабочае клясы, прайшоўшыя школу капіталістычнай эксплёатацыі, школу рэвалюцыйнай барацьбы за ўстанаўленьне, захаваньне і замацаваньне пралетарскай дыктатуры.

У другі перыяд масавага прытоку ў партыю, у перыяд барацьбы за ленінізм з трацкістамі і правымі, у партыю яшчэ ўступалі і старыя кадравыя рабочыя, але ў гэтым наборы было, аднак, ужо нямала і маладых, менш загартаваных у барацьбе рабочых. Дэманструючы поўную салідарнасьць з партыяй і давер'е да яе, імкнучыся захаваць непарушнае адзінства УсеКП(б) і яе маналітнасьць, новыя тысячы пралетараў пашлі ў партыю для актыўнай барацьбы з апартуністычнымі наскокамі на генэральную лінію партыі, на яе ленінскі ЦК. Гэтыя кадры, прайшоўшыя школу барацьбы ў апартунізмам у розных яго праявах, вядучы актыўную барацьбу за ажыцьцяўленьне генэральнай лініі партыі, мелі магчымасьць, у параўнальна кароткі тэрмін, ідэйна загартавацца, узьняць свой палітычны ўзровень і выпрацаваць у сябе навыкі кіраўніцтва масамі ў барацьбе за сацыялізм.

І, урэшце, трэці перыяд масавага прытоку ў партыю мы маем цяпер, прыток, выкліканы посьпехамі пяцігодкі, рашаючымі посьпехамі партыі ў галіне індустрыялізацыі і калектывізацыі. Гэтыя новыя кадры ў значнай сваёй большасьці зьяўляюцца маладняком рабочай клясы, не прайшоўшым тэй школы, якую праходзілі члены партыі папярэдніх масавых набораў. Сярод іх нямала пядаўніх выхадцаў і з сялянства і з гарадзкіх дробна-буржуазных пластоў. Удзельная вага новага масавага прытоку ў партыю не малая. Даволі сказаць, што на 1 чэрвеня 1931 г. кандыдаты складалі да 40 проц. усяго складу партыі.

Гэты факт накладае на нас вялізарнейшыя абавязацельствы ў адносінах работы над новым прытокам. З гэтага партыйнага маладняка нам неабходна выкаваць стойкіх ленінцаў-бальшавікоў, якія могуць актыўна змагацца за генэральную лінію, карыстацца аўтарытэтам у іншай рабочай масе, могуць панесьці за сабой масы на барацьбу за вугаль, мэталь, хлеб, на перамаганьне труднасьцяй, на барацьбу за практычнае ажыцьцяўленьне сацыялістычных задач. Бяз гэтага няма грані паміж членам партыі і іншай масай рабочых.

Тут перад намі вялікая штодзённая работа, якая ня вычэрпваецца адной толькі партыйнай вучобай у вузкім сэнсе гэтага слова, бо «без работы, без барацьбы кніжнае вядзеньне камунізму, з камуністычных брашур і твораў нічога ня варта, бо яно працятвала-б стары (азрыў паміж тэорыяй і практыкай» (Ленін). Задача выкоўваньня бальшавікоў з гэтых новапрыйшоўшых у партыю пластоў вымагае вялікай штодзённай, настойлівай работы і па палітычнай асьвеце гэтых членаў партыі, і па ўцягненьні іх у актыўнае партыйнае жыцьцё, і па праверцы ступені баявой гатоўнасьці кожнага з іх у тых выпадках, калі патрэбны бальшавіцкая самаадданасьць і цьвёрдасьць.

А ці ўсё добра ў нас у гэтай галіне? Не, далёка ня ўсё. Возьмем партыйную вучобу кандыдатаў партыі, г. зн. ня менш ⅓ усяго складу партыі. Прыходзіцца канстатаваць, што нават па такіх важнейшых прамысловых раёнах, як Ленінград, Масква, Украіна, Урал, ахоп кандыдатаў сеткаю партасьветы мізэрны, ледзь дасягае 30 проц. усіх кандыдатаў. А калі да таго-ж улічыць процант наведваньня гэтых школ, дык рэальны процант ахопу вучобай акажацца яшчэ больш нізкім. Возьмем далей пытаньне аб партнагрузцы кандыдатаў. Тут таксама далёка ня ўсё добра. Скрозь і ўсюды бывае так, што дадуць новаўступіўшаму ў партыю якую-небудзь нагрузку, і прадастаўляць яго самому сабе. Ясна, што пры такой пастаноўцы марксыцка-ленінскага выхаваньня мы патрэбны нам тып бальшавіка з гэтага маладняка ня выкуем. Ясна, што такая пастаноўка работы з кандыдатамі партыі ў канчатковым выніку ня можа ня прывесьці да значнага адсеву.

Гэты адказьнейшы вучастак партыйнай работы не заняў пакуль яшчэ належнага месца ў рабоце нашых арганізацый. Тут адбіваецца наразуменьне новай абстаноўкі, новых умоў, калі іменна з гэтага партыйнага маладняка нам неабходна выхаваць правадыроў рабочых і працоўных мас. Такава другая асаблівасьць новай абстаноўкі ў справе марксыцка-ленінскага выхаваньня партыйных кардаў, якая вымагае значных паляпшэньняў у гэтай галіне работы.

Нельга таксама выпускаць з-пад увагі і новае разьмяшчэньне па адлегласьці вытворчых сіл, якое адбываецца ў краіне, а значыцца, і новае разьмяшчэньне асноўных мас рабочай клясы. Партыя стала на шлях стварэньня новай вугальна-мэталюргічнай базы на Ўсходзе. Дзесяткі і сотні гігантаў прамысловасьці будуюцца ў такіх куткох Савецкага саюзу, дзе да нядаўняга часу і сьлядоў прамысловасьці ня было. На аснове пасьлядоўнага ажыцьцяўленьня нацыянальнай палітыкі партыі індустрыялізуюцца адсталыя калёніяльныя раёны былой Расіі. Геаграфія разьмяшчэньня прадукцыйных сіл нашай краіны церпіць значныя зьмены.

Вы ведаеце, як востра стаіць праблема кадраў для новабудоўляў, якія нярэдка прыходзіцца ствараць літаральна на голым месцы. Мы гэтыя кадры даем з іншых прамысловых раёнаў. Ідзе, значыцца, працэс пераразмеркаваньня наяўных у нас кадраў рабочых і інжынэрна-тэхнічных работнікаў.

Ясна, што ў гэтых новых прамысловых пунктах нам трэба разгарнуць асаблівую вялікую партыйную работу. Месцы тут не насіджаныя, кадры ще ўсталяліся, умовы жыцьлёвыя і бытавыя таксама не заўсёды пакуль яшчэ адпавядаюць важнасьці гэтых будоўляў для народнай гаспадаркі. Партыйнае вока і моцнае партыйнае кіраўніцтва тут асаблівае неабходны. Дас партыя туды, на новабудоўлі, людзей нямала. Але ня гэтым шляхам мы даб'емся карэннага вырашэньня праблемы падрыхтоўкі кадраў паогул і партыйных у прыватнасьці для новых прамысловых раёнаў.

Возьмеце вы далей надпрэсьлёбі, дзе ў нас панава стварэецца індустрыяльная база. І там ідзе вярбоўка новых членаў партыі, прыток за лік нацыянальна-пралетараў. А кадраў партработнікаў мала, надзвычай мала.

Нам неабходна каваць гэтыя партыйныя кадры з нацыяналаў, ствараць з іх добрых бальшавікоў, бо на адных тых, што прысылаюцца, нельга вывесьці тую вялізарную работу, якая там разгортваецца. Трэба разгарнуць падрыхтоўку гэтых кадраў на месцы. Партыйныя арганізацыі абавязаны зьвярнуць асаблівую ўвагу і наладзіць штодзённае кіраўніцтва разгортваньнем партыйнай работы ў гэтых важнейшых пунктах сацыялістычнай будоўлі. Там, на месцы, мы павінны выкаваць моцныя партыйныя арганізацыі, адольныя забясьпечыць і адпаведныя тэмпы будаўніцтва, і адпаведныя матар'яльна-бытавыя ўмовы для рабочых.

Таму, вызначаючы чарговыя задачы марксыцка-ленінскага выхаваньня, ніяк нельга абстрагавацца ад такога важнага моманту, як пераразмеркаваньне мас прамысловага пралетарыяту ў сувязі з новай геаграфіяй разьмяшчэньня прадукцыйных сіл краіны.

Новую абстаноўку ў справе марксыцка-ленінскага выхаваньня вызначаюць і тыя сацыяльна-эканамічныя зрухі, якія адбыліся на вёсцы. Я маю на ўвазе ахоп да 15 млн. бядняцка-серадняцкіх гаспадарак калектывізацыяй і выхаваўчыя задачы, якія адсюль вынікаюць. Гэтыя калгасьнікі прашлі добрую школу вострай клясавай барацьбы, што разгарнулася на вёсцы ў сувязі з разгорнутай калектывізацыяй і ліквідацыяй кулацтва як клясы. Але само сабою зразумела, што гэтым нашы выхаваўчыя задачы на вёсцы ні ў якім разе ня зьнімаюцца. У свой час тав. Сталін падкрэсьліваў, што «было-б памылкова думаць, што калі даны калгасы, дык дана ўсё неабходнае для пабудовы сацыялізму. Тым больш памылкова было-б думаць, што члены калгасаў ужо ператварыліся ў сацыялістаў. Не, прыдзецца яшчэ шмат напрацаваць над тым, каб перарабіць селяніна - калгасьніка, выправіць яго індывідуалістычную псыхалёгію і зрабіць з яго сапраўднага працаўніка сацыялістычнай грамады» (Сталін).

Працэс машынізацыі сельскай гаспадаркі на аснове разгорнутага саўгаснага і калгаснага будаўніцтва, клясавая барацьба вакол гэтага будаўніцтва і ўсё ўзрастаючы пралетарскі ўплыў на вёсцы,—усё гэта мае буйнейшае значэньне для перапрацоўкі псыхалёгіі калгасьнікаў. Але і наша марксыцка-ленінскае выхаваньне павінна ісьці ў нагу з гэтай задачай. Гэта значыць, што нам трэба ўсямерна ўмацоўваць нашу партыйную арганізацыю на вёсцы, павышаючы ідэйна-тэарэтычны ўзровень яе членаў, выкоўваючы стойкіх барацьбітоў за сацыялістычную сельскую гаспадарку.

За апошні год у партыю ўлілося нямала новых членаў з асяродзішча калгасьнікаў. Калі перад намі, як я вышэй гаварыў, стаіць задача разгорнутай работы па марксыцка-ленінскім выхаваньні кандыдатаў партыі фабрычна-заводзкіх партарганізацый, то ў няменшай меры і з большай складанасьцю гэта задача стаіць перад намі ў адносінах кандыдатаў партыі вясковых партарганізацый. А прыток-жа ў гэтыя арганізацыі даволі значны і ён будзе бясспрэчна расьці на аснове посьпехаў сацыялістычнай перабудовы сельскай гаспадаркі. Гэту задачу нам ні ў якім разе ня трэба забываць, вызначаючы чарговыя задачы марксыцка-ленінскага выхаваньня.

Важнейшым пытаньнем марксыцка-ленінскага выхаваньня зьяўляецца пытаньне аб рабоце з партыйным актывам. Размах сацыялістычнага будаўніцтва высуну ў на кіруючую работу ў розных галінах сацыялістычнага будаўніцтва і, у прыватнасьці, на кіруючую партыйную работу шматлікія кадры параўнаўча маладых членаў партыі. Возьмеце, напрыклад, сакратароў нашых цэхавых ячэек. Вы сустрэнеце сярод іх эусім маладых членаў партыі са стажам 1929-30 году. А пяперашні-ж цэх—гэта ня цэх прадпрыемства аднаўленчага пэрыяду. Цяперашні цэх — гэта нярэдка цэлы завод з тысячамі рабочых. Цэх у жыцьці заводу адыгрывае зараз буйнейшую ролю. А партыйнае кіраўніцтва там скрозь і ўсюды з маладняка. Возьмеце вы далей сакратароў заводзкіх парткомаў і нават раённых партыйных камітэтаў. І сярод іх вы знойдзеце нямала маладых членаў партыі.

Гэта нямінучы і зусім натуральны працэс далучэньня да кіраўніцтва партыйнага маладняка. Небясьпекі ў гэтым няма. Але гэты факт, зразумела, да часткі-колечы нас абавязвае. Трэба, каб гэтыя маладыя кадры, якія ідуць да кіраўніцтва, былі тэарытычна падкаваны. выхаваны ў духу бальшавіцкіх традыцый і прынцыпаў.

Між тым іменна гэтыя таварышы з прычыны іх крайняй перагрузкі менш за ўсё ахоплены сыстэмай марксыцка-ленінскага выхаваньня. Вось у гэтым вялікая небясьпека. У наш век, пры нашых тэмпах, нельга не працаваць над павышэньнем свайго тэарытычнага ўзроўню. Хто не расьце, таго падзеі нямінуча абганяюць, той можа аказацца ў хвасьце падзей. Зразумела, практычная работа зьяўляецца сама па сабе добрай школай. Але гэты практычны вопыт неабходна сыстэматычна ўзбагачаць тэарытычнымі ведамі. Бо бяз гэтага ў абстаноўцы не з'арыентуешся. Таму наш абавязак ва што-б там ні стала перамагчы труднасьці, якія выцякаюць з перагружанасьці партактыву, і наладзіць сыстэматычную работу нашага партыйнага актыву ў тых ці іншых формах.

У Ленінградзе, напрыклад, кожны месяц зьбіраюць на 5 дзён актыў і прапрацоўваюць з 1м¹ пасобныя пытаньні, знаёмяць з дыскусіямі на розных вучастках тэарытычнага фронту, з навінамі палітычнай і тэарытычнай літаратуры. Гэта вельмі добра, але гэтага не даволі ўжо хаця-б таму, што ня ўсюды гэту форму ўжываюць. А чаму-б нам ня ўвесьці ў сыстэму рэфэраты, лекцыі, даклады для актыву, стварэючы для гэтага і ў Маскве пры Камакадэміі ці Інстытуце Маркса-Энгельса-Леніна і ў буйных правінцыяльных цэнтрах спэцыяльныя лектарскія групы? Ці ў нас гэтых магчымасьцяй няма? Есьць яны, гэтыя магчымасьці, але мы іх не скарыстоўваем. Ня толькі гэтай формай вычэрпваецца марксыцка-ленінскае выхаваньне актыву. Нам неабходна прыстасоўваць розныя формы, формы гібкія, якія-б улічвалі перагружанасьць актыву практычнай работай, перамагаючы труднасьці на шляху разгортваньня тэарытычнай вучобы актыву, бо «імкненьне практыкаў адмахнуцца ад тэорыі няне практыкаў адмахнуцца ад тэорыі пяне рэчыць усяму духу ленінізму і можа мець у выніку вялікія небясьпекі для справы» (Сталін).

Нам ня трэба выпускаць з-пад увагі і новых задач у справе марксыцка-ленінскага выхаваньня камсамолу. Камсамол вырас да 5 млн. Гэта-ж вялізарная армія, якая вырасла ў два разы за апошнія год-два. Значная частка гэтага масавага прытоку ў камсамол—моладзь, якая прыходзіць з дробна-буржуазных пластоў гораду і вёскі. Камсамол адзін пластоў гораду і вёскі. Камсамол адзін пластоў гораду і вёскі. Тамуу нам надзвычай важна ўзмацніць марксыцка-ленінскае выхаваньне ў камсамоле. Між тым з штодзённым партыйным кіраўніцтвам камсамолам у нізавых арганізацыях усё яшчэ ня ўсё добра, ня гледзячы на рад вельмі добрых і канкрэтных рэзалюцый на гэтым пытаньні. Спадзяваецца і разьлічвайць на сілы толькі камсамолу ў гэтай справе, справе марксыцка-ленінскага выхаваньня помаркскыцка-ленінскага выхаваньня новых 2½ млн., ніяк ня прыходзіцца. Камсамольцы самі такую складаную задачу на выцягнуць. Таму ўвагу партарганізацый да пастаноўкі марксыцка-ленінскага выхаваньня ў камсамоле неабходна ўзмацніць дапамагаючы яму і прапагандысцкімі сіламі, і матар'яльнымі сродкамі, і штодзённым кіраўніцтвам.

І нарэшце апошняе, хаця далёка не апошняе па сваім значэньні—гэта пытаньне аб барацьбе з апартунізмам на даным этапе. Той-сёй думае, што калі пэўнымі палітычнымі пляцформамі, з пэўнымі палітычнымі пляцформамі, з пэўнымі правадырамі, то значыцца, няма і апартуністычных ваганьняў і хістаньняў у нашых радох. Такое ўяўленьне няправільнае тэарытычна і небяспечна на практыкай. Тэарытычна гэта няправільна таму, што раз яшчэ ёсьць клясы, раз у краіне яшчэ ідзе клясавая барацьба, значыцца ёсьць яшчэ і напор на пралетарыят і яго авангард клясава-варожай адзалёгіі, значыць нямінучыя ва ўмовах цяжкасьцяй сацыялістычнага будаўніцтва вядомыя хістаньні і ваганьні сярод пайменш стойкіх груп членаў партыі. Практычна-ж гэта ўяўленьне таксама не пацьвярджаецца хаця-б таму, што мы зьяўляемся сьведкамі не малой колькасьці праяўленьняў і правага ўхілу і «лявацкіх» заскокаў на практыцы.

Але якую асаблівасьць важна ўлічыць на даным этапе? Неабходна ўлічыць, што зараз апартунізм асабліва трусьліва, баючыся пасьля разгрому «левых», правых і права-«лявацкага» блёку выступаць адкрыта, з закончанай сыстэмай поглядаў. Ужо права-«лявацкіх» блёк Сырцова-Ламінадзэ, як вы памятаеце, не адрозьніваўся асаблівай адважнай. Тым больш трусьліва апартунізм цяпер, калі само жыцьцё з асаблівай наглядзнасьцю пацьвердзіла правільнасьць генэральнай лініі партыі.

Таму марксыцка-ленінскае выхаваньне павінна ўзьняць яшчэ на больш высокую ступень клясавую пільнасьць членаў партыі, узброіць іх для барацьбы супроць усіх і ўсялякіх праяў апартунізму, і якіх-бы замаскаваных формах ён не выступаў.

Такавы асноўныя асаблівасьці новай абстаноўкі і асноўныя задачы ў справе марксыцка-ленінскага выхаваньня членаў партыі.

За дыфэрэнцыяваны падыход да розных груп членаў партыі

З усяго вышэйсказанага выцякае, што пры арганізацыі марксыцка-ленінскага выхаваньня ня можа быць аднолькавага падыходу да розных груп членаў партыі па-за залежнасьцю ад вытворча-бытавых умоў і ўзроставых асаблівасьцяй.

Раз партыйная вучоба і ўся справа партыйнага выхаваньня павінна быць цясьнейшым чынам увязана з задачамі сацыялістычнага будаўніцтва ў цэлым і задачамі данай фабрыкі, капальні, саўгасу, калгасу ў прыватнасьці, значыць нам неабходна дыфэрэнцыяваць падыход да розных груп рабочых. І ўяднаснах гарняка і мэталюрга, і рабочага саўгасу перад намі ў канчатковым выніку стаіць дыялькавая выхаваўчая задача. На шляху вырашэньня гэтай задачы, формы і нават зьмест партыйнай вучобы павінны быць для розных груп рабочай клясы розныя.

Толькі пры гэтых умовах будзе дасягнута сапраўдная ўвязка палітычнай вучобы з практычнымі задачамі данай вытворчасьці. Толькі пры гэтай умове нашы прапагандысты будуць ня толькі крышыльваць, і вельмі часта не да рэчы, так званы мясцовы матар'ял, а адпраўляючыся ад гэтага мясцовага матар'яду, узьнімуць палітвучобу на належную тэарытычную вышыню. Нельга таксама не дыфэрэнцыяваць падыходу да розных узроставых рабочых груп і груп рабочых з розній агульна-адукацыйнай падрыхтоўкай.

Партыя ва ўсіх галінах сацыялістычнага будаўніцтва змагаецца за спэцыялізацыю кіраўніцтва. І разьбіваньне аб'яднаньняў прамысловасьці, і перабудова спажыўкаапэрацыі па прынцыпе спэцыялізаванных аб'яднаньняў маюць на ўвазе спэцыялізацыю кіраўніцтва, пры якой лягчэй аўладаць дэталямі справы, тэхнікай яе. У нашай работе па арганізацыі партыйнай вучобы мы таксама павінны і пры камплектаваньні сеткі і ў працэсе самай вучобы выходзіць з задачы дыфэрэнцыяванага падыходу да розных груп рабочых у залежнасьці ад вытворча - бытавых умоў, узрастаючых асаблівасьцяй, узроўню іх агульнай пісьменнасьці. Толькі пры гэтай умове мы здолеем дабіцца значнага паляпшэньня партыйнай вучобы і зьмяншэньня адсеву з сеткі партыйнай асьветы.

Надзвычайна востра стаіць зараз праблема падрыхто

Тры зьвеньні

ПОЎНАСЬЦЮ АФОРМІЦЬ ПАДПІСКУ, ВЫКАНАЦЬ ЗАДАНЬНЕ ПА АДНААСОБНЫМ СЭКТАРЫ, АХАПІЦЬ СЭЗОНЬНІКАЎ І НОВЫЯ КАДРЫ РАБОЧЫХ

19.800 р. замест 75 тысяч

афармлена падпіскі ў Бабруйску

З 17 па 25 жніўня брыгады Бабруйскага райпрафсавету і саюзу фінансава-банкаўскіх работнікаў правялі масавую праверку афармленьня і ўнясеньня першых узносаў па пазыцы па прадпрыемствах і ўстановах гораду. Ахоплена 100 прадпрыемстваў і ўстаноў.

Брыгады выявілі, што з 13.534 работнікаў ахоплена падпіскай 11.912, не ахоплена 1.622. Гэта даныя толькі па 100 установах і прадпрыемствах, а ў горадзе іх ёсьць звыш 300.

Камісіі садзейнасьці ў большасьці бязьдзейнічаюць. На заводзе імя Варашылава камісія садзейнасьці адмовілася ўнесьці першы ўзнос з зарплаты за першую палову жніўня. На 4-м вучастку ваеннаму адлічаныя 1.900 руб. паводле загаду кіраўніка ВАНЮШАВА скарыстаны на іншыя мэты, камісія садзейнасьці нават ня ведала аб гэтым.

На дрэвапрацоўчым камбінаце яшчэ ня ўнесены 14.500 руб. за першую палову жніўня. Бухгальтэрыя катэгарычна адмаўляецца адлічаць узносы ў тэрміны выплаты — два разы ў месяц. Толькі нязначная частка прадпрыемстваў і ўстаноў падала заявы аб афармленьні падпіскі ў ліпені, большасьць аформіла ў жніўні.

Мясцовыя арганізацыі ня сочаць за тым, як выплачваецца зарплата на прадпрыемствах і ўстановах. Ня гледзячы на катэгарычныя дырэктывы вышэйшых органаў, зарплата выдаецца са спазьненьнем.

8 прадпрыемстваў гораду замест 20.000 руб. унесьлі толькі 620 руб. Агул замест 75.000 руб. узносаў па пазыцы паступіла ў касы Дзяржбанку толькі 19.800 руб.

Кіруючыя работнікі Дзяржбанку і ашчадкасы зараз знаходзяцца ў адпачынку. Гэта характарызуе адносіны раённых арганізацый да выкананьня фінплану і рэалізацыі пазыкі.

Прарывы ў афармленьні падпіскі павінны быць неадкладна ліквідаваны.

П—а.

„ГЭТА НЕ МАЯ СПРАВА, Я—АДМІНІСТРАТАР"

Абсьледваньне афармленьня падпіскі па радзе прадпрыемстваў гор. Менску паказала, што многія адміністратары не зразумелі таго, што яны нясуць непасрэдную адказнасьць за афармленьне падпіскі і своечасовае паступленьне ўзносаў. Нам, дырэктара польпэдтэхнікуму тав. МЭТЭ ў часе праверкі афармленьня падпіскі заявіў: «членаў бюро парт'ячэйкі няма, членаў камісіі садзейнасьці таксама, таму ніякіх вестак аб падпісцы не магу даць. Гэта не мая справа. Я—адміністратар».

У Гапоўдартрансе адмовіліся дапамагчы брыгадзіру Дзяржбанку, які прышоў аформіць падпіску. Саўгас «Чырвоны транспарт» даў весткі аб тым, што пазыка рэалізавана на 13.300 руб., а канчаткова аформіў падпіску толькі на 4.700 рублёў. Беларэдтэхнікум пры афармленьні зьнізіў папярэднюю падпіску з 16.000 руб. да 10.150 руб.

Прыкладам добрага афармленьня падпіскі можа служыць калектыў БАН, дзе да тэрміну ўнесена 4.355 руб.

БРЫГАДА.

Тонькі 3 проц. заданьня

ЛЮБАНЬ. (Наш кар.). Паводле пляну любаньскі месцачковы савет павінен рэалізаваць пазыкі сярод аднаасобнікаў на 5.000 руб. Дагэтуль, з-за адсутнасьці масава-растлумачальнай работы і апартуністычнай бязьдзейнасьці, рэалізавана аблігацый на 150 руб., або 3 проц. заданьня.

Партыйныя і прафесыянальныя арганізацыі раёну павінны дабіцца ліквідацыі прарыву ў падпісцы па аднаасобным сэктары. Вінаватых у зрыве падпіскі трэба прыцягнуць да суровай адказнасьці.

Зьнесьці бюракратычныя рагаткі

РАСОНЫ. (Наш кар.). Раён рэалізаваў сярод аднаасобнікаў каля 2.000 руб., або 2 проц. заданьня. Інструктар дыстанцыі дарожнага будаўніцтва Лабуноў, які рэалізаваў сярод аднаасобнікаў за наяўны разьлік аблігацый на 250 руб., сустрэў бюракратычныя адносіны з боку райвыканкамаў і райбанку. Яны адмовіліся адразу-ж прыняць ад яго грошы і выдаць аблігацыі і прымушалі некалькі раз наведваць крэдытныя установы.

Райбанк і райвыканкамы не наладзілі ўліку рэалізаваных за наяўны разьлік аблігацый.

ГАЛЯНКОЎ.

Чорная дошка

раёнаў, якія зрываюць падпіску аднаасобнікаў

Брагінскі раён	4,2%	заданьня
Буда-Кашалёўскі	8,6%	»
Веткаўскі	2,0%	»
Вушацкі	0,7%	»
Дубровенскі	1,5%	»
Дрысенскі	2,1%	»
Заслаўскі	5,8%	»
Клічаўскі	4,2%	»
Кармянскі	4,6%	»
Чырвонапольскі	2,2%	»
Лёзьнянскі	0,6%	і г. д. »

Лепшыя раёны

па рэалізацыі пазыкі сярод аднаасобнікаў

(Паводле даных на 20 жніўня)

БЯЛЫНІЦКІ РАЁН — 91 ПРОЦ. ЗАДАНЬНЯ.

ЛАГОЙСКІ РАЁН — 77 ПРОЦ.

ЛЕПЕЛЬСКІ РАЁН — 161,9 ПРОЦ.

ПЛЕШЧАНІЦКІ РАЁН — 82,2 ПРОЦ.

„Да ведама і выкананьня"

ТАЛАЧЫН. (Наш кар.). Талачынскі раён ганебна адстае ў рэалізацыі пазыкі на вёсцы. На аднаасобным сэктары выканана толькі 18,3 проц. заданьня. Загадчык райвыканкамаў Цюхай, атрымаўшы з Менску тэлеграму аб правядзеньні падпіскі сярод аднаасобнікаў, наладжыў на ёй рэзалюцыю: «Да ведама і выкананьня» і паклаў пад сукно. Райфа таксама ня кіруе падпіскай на вёсцы.

Л.

Пабудова танкеты

"Фінбанкаўскі работнік БССР"

ЦП саюзу фінансава-банкаўскіх работнікаў пастанавіла правесьці сярод членаў саюзу збор сродкаў на пабудову танкеты «Фінбанкаўскі работнік БССР». Усяго павінна быць сабрана 10.000 руб.

Калектыў работнікаў Бабруйскага аддзяленьня Дзяржбанку пастанавіў адлічыць 2 проц. месячнага заработку на пабудову танкеты і выклікаць раймясцовы Магілёва і Віцебску.

ЦП саюзу ўпэўнена, што прафарганізацыі БССР падхопяць выклік Бабруйску і правядуць збор сродкаў з тым, каб да 14-цігодзьдзя Кастрычніцкай рэвалюцыі фінбанкаўскія работнікі БССР змаглі паднесьці танкету ў падарунак вартаўніку сацыялістычнага будаўніцтва — Чырвонай арміі.

ПАРХОМЕНКА.

Прывітаньне ўдарнікам фінансавага фронту

Вам, выпускнікам Цэнтральных фінансава-эканамічных курсаў, ударнікам фінансавага фронту — шчырае бальшавіцкае прывітаньне!

Вялізарныя тэмпы пасьпяховага сацыялістычнага будаўніцтва СССР патрабуюць ад усёй фінансавай сыстэмы напружанай балевой работы па пашырэньні крыніц сацыялістычнага накапленьня «для фінансаваньня нашай індустрыі, нашых калгасаў і саўгасаў». Фінансавая сыстэма можа справіцца з задачамі, якія ўскладзены на яе партыяй толькі пры ўмове рашучай і бязьдакладнай перабудовы работы па новаму, пры ўмове ўзмацненьня фінансавага апарату сьвежымі сіламі.

Выпускніку павінны перанесьці набытыя імі фінансава-эканамічныя веды ў практыку спрэдняга і нізавога зьвяна фінансавага апарату.

Спадзяюся, што ваша работа будзе поўнасьцю адпавядаць задачам і тэмпам сацыялістычнага будаўніцтва.

Народны камісар фінансаў БССР

ХАЦКЕВІЧ.

Ня вывозіцца 5 вагонаў сыру

ШКЛОЎ. (Наш кар.). Прадукцыя 12 сыраварных заводаў Шклоўскага раёну, якая павінна была быць адпраўлена ў рабочыя цэнтры, ляжыць на складзе, бо Велікаанская ня прысылае тары. Патрабавалі 1.200 скрынь тары для галяндзкага сыру, Велікаанскаю прысланы толькі 5 скрынь; 5 вагонаў галяндзкага сыру ляжыць у склапах.

Велікаанскаю зусім не адказвае на запатрабаваньні аб прысылцы тары. Гэта затрымлівае хуткага ўмацаньня ВК-РСІ. Інакш загатоўленая прадукцыя будзе разбазарана на месцы.

К.

ПЛЕНУМ МЕНСКАГА ГАРКОМУ КП(б)Б

ВЫНІКІ ПЕРАВЫБАРАЎ БЮРО ЯЧЭЕК І ЧАРГОВЫЯ ЗАДАЧЫ ПАРТАРГАНІЗАЦЫІ

(З дакладу сакратара гаркому тав. КАВАЛЬЧУКА)

Перавыбары бюро ячэек у гэтым годзе праходзілі ва ўмовах буйных перамог, дасягнутых партыяй у справе будаўніцтва сацыялізму ў нашай краіне, як у галіне прамысловасьці, так і ў галіне рэканструкцыі сельскай гаспадаркі.

Наперакор акапітулянцкім прадраканьням правых і «левых» апартуністаў аб непасільнасьці тэмпаў, наперакор іх паклёпніцкай балбатні аб няправільнасьці генэральнай лініі партыі, мы з часу ад XVI партыезьезду і асабліва ў трэцім рашаючым годзе пяцігодкі, дасягнулі вялізарнейшых посьпехаў на ўсіх вучастках сацыялістычнага будаўніцтва. Гэтыя посьпехі ёсьць рэзультат бальшавіцкай работы партыйных арганізацый, іх бязьлітасная барацьба з апартунізмам, за генэральную лінію партыі.

Справаздачна-перавыбарчую кампанію бюро ячэек менская партарганізацыя правяла пад лёзунгам яшчэ большай мабілізацыі партыйных, рабочых і калгасных мас на выкананьне задач, пастаўленых партыяй у трэцім рашаючым годзе пяцігодкі. Гэта кампанія суправаджалася масавым прыхлівам у рады партыі лепшых пралетараў-ударнікаў, лепшай часткі камсамольскай арганізацыі. За 7 месяцаў наша арганізацыя ўзрасла на 1.028 чал. З гэтай колькасьці амаль палова ўступіла ў партыю за час справаздачна-перавыбарчай кампаніі. Гэта сьведчыць аб найвялікшым давер'і нашай партыі сярод шырокіх рабочых і калгасных мас, гэта паказвае, што мы ў рабочых масах і калгасьніках маем непахісную рашучасьць і гатоўнасьць разам з партыяй, пад яе кіраўніцтвам змагацца на фронце абвострэнай клясавай барацьбы за ажыцьцяўленьне задач сацыялістычнага будаўніцтва. Перавыбары кіруючых парторганаў паказалі, што менская арганізацыя прасякнута адным імкненьнем — перамагчы ўсе труднасьці, якія стаяць на шляху сацыялістычнага будаўніцтва. Такі агульна-палітычны вынік перавыбарчай кампаніі бюро ячэек.

Дэкларацыйныя пастановы нікому непатрэбны

Аднак, няправільна было-б сьцьвярджаць, што ў часе перавыбарчай кампаніі нідзе ніякіх недахопаў ня было. На радзе ячэек мы мелі невыстарчальную ўвагу да гэтай важнейшай палітычнай кампаніі. Ня гледзячы на шмат недахопаў у рабоце некаторых ячэек, ня гледзячы на тое, што прамфінпляны на радзе прадпрыемстваў сыстэматычна ня выконваюцца, паасобныя вытворчыя парт'ячэйкі ня здолелі, як належыць, мабілізаваць сваю ўвагу і ўвагу рабочых мас на ліквідацыю прарываў, але супакойвалі сябе прыняцьцем дэкларацыйных рэзалюцый, у якіх работа прыхарошвалася здавальняючай. Такія дэкларацыйныя рэзалюцыі, якія не пацьверджаны канкрэтнымі фактамі і вынікамі барацьбы за прамфінпляны, нікому непатрэбны. Гэта ня ёсьць мабілізацыя мас на выкананьне вытворчых задач.

Наша задача замацаваць дасягнутыя вынікі і яшчэ ў большай меры намагчы свае сілы на ажыцьцяўленьне апошніх пастаноў партыі і ўказаньняў тав. Сталіна ў адпаведнасьці з новым этапам сацыялістычнага будаўніцтва.

З бальшавіцкай настойлівасьцю рэалізаваць указаньні тав. Сталіна

Чэрвеньскі пленум менскага гаркому КП(б)Б прызнаў работу па выкананьні прамфінпляну за 5 месяцаў нездавальняючай, і вызначыў рад канкрэтных мерапрыемстваў для забесьпячэньня пералому ў гэтай рабоце. І зараз становішча выкананьня прамфінпляну сьведчыць аб тым, што некаторыя парт'ячэйкі вельмі мала працавалі ў справе ажыцьцяўленьня дырэктыў чэрвеньскага пленуму. Прарывы па радзе прадпрыемстваў, якія мелі месца раней, не ліквідаваны і зараз. Праўда, значная частка нашых прадпрыемстваў зрабіла вялікі зрух. Агульны-ж малюнак выкананьня прамфінпляну даволі рознастайны. Сыстэматычна перавыконвае прамфінплян толькі адзінае прадпрыемства — гэта завод «Бальшавік», рэшта — падягнуліся за апошні час, але не забясьпечылі яшчэ ў належнай меры ліквідацыі прарываў, дапушчаных у мінулым. Прамфінплян на заводзе «Бальшавік» за 7 месяцаў выкананы на 106,48 проц., на заводзе імя Варашылава ў першым квартале на 77,08 проц., у другім — 71,08 проц. і за ліпень — 61,3 проц., на «Камунары» — у першым квартале — 73,7, у другім — 62,1 проц. і за 7 месяцаў — 69 проц., на Эльводзе ў першым квартале 123 проц., у другім — 111,3 проц. Фабрыка імя 8-га сакавіка, якая ў першым і другім квартале мела буйныя прарывы, за ліпень значна падцягнулася, выканала прамфінплян на 108 проц. Таксама за гэты-ж месяц хлебазавод свой прамфінплян выканаў на 104 проц. і «Полымя рэвалюцыі» — на 125,5 проц. Такі розпастайны малюнак з выкананьнем прамфінпляну. Вытворчыя посьпехі, пасьпяховае выкананьне прамфінпляну, бязумоўна, залежаць ад перабудовы ўсёй партыйнай, прафсаюзнай і гаспадарчай работы ў адпаведнасьці з новымі ўмовамі і задачамі, аб якіх гаварыў на нарадзе гаспадарнікаў тав. Сталін. Там, дзе партыйныя арганізацыі правільна зразумелі новыя ўмовы, дзе перабудавалі сваю работу, дзе ператварылі ў жыцьцёвы баявы практычны ўстаноўкі тав. Сталіна, там мы маем значны пералом, паляпшэньне з выкананьнем прамфінпляну. Адсюль вывад, што трэба кіраваць прадпрыемствам не наогул, а канкрэтна, апэрацыйна. Гэта значыць, паглыбіцца ва ўсе поры жыцьця прадпрыемства, ва ўсе дробязі, бо з дробязей складаюцца вялікія справы. Трэба ўвайсьці з галавой у тэхніку справы, у тэхніку працы у працэсы вытворчасьці для таго, каб правільна кіраваць, на-ходу зьяшчыць недахопы і гэтым самым забясьпечваць ня толькі выкананьне, але і перавыкананьне вытворчых пратрам.

Адным з важнейшых пытаньняў, якое павінна забясьпечыць выкананьне прамфінпляну, зьяўляецца правільнае правядзеньне гаспадарчага разрахунку. Чэрвеньскі пленум даў вычарпальныя дырэктывы па гэтым пытаньні, аднак, мы маем такое становішча, калі гаспадарнікі, паасобныя дырэктары не зразумелі, як сьлед, гэтай задачы, падыйшлі да гэтай важнейшай справы фармальна. Нават ёсьць такія факты, калі гаспадарнікі (фабрыка імя Крупскай і «8-га сакавіка») проста ўхіляюцца ад пераводу прадпрыемстваў на гаспадарчы разрахунак. Наша задача заключаецца ў тым, каб ужараніць гаспадарчы разрахунак ва ўсе вытворчыя зьвенні. Задача, як гаварыў тав. Сталін, павінна заключацца ў тым, каб на падставе правільнага ўжываньня гаспадарчага разрахунку, павялічыць унутрыпрамысловыя накапленьні.

Ліквідаваць ураўнілаўку

Задача барацьбы з дзякучасьцю рабочай сілы ажыцьцяўляецца ў нас надзвычай слаба. Ні адно аб'яднаньне ў Менску ня можа пахваліцца, што яно хоць што-небудзь зрабіла ў справе арганізаванага набору рабочых. А пытаньне дзякучасьці рабочай сілы па навозным. Вось некаторыя лічбы і факты: толькі 280, прычым за бягучы год зволілася з гэтага прадпрыемства 500 чал. На фабрыцы імя Крупскай з 1 тэрміна па 16 ліпеня зволілася 94 чал., на фабрыцы «Кастрычнік» за 6 месяцаў зволілася 450 чал. Такое-ж самае зьявішча мы маем на «Камунарцы» і на радзе іншых прадпрыемстваў.

На пытаньне, у чым прычыны дзякучасьці рабочай сілы надзвычай выразны адказ даў тав. Сталін на нарадзе гаспадарнікаў. Гэтыя прычыны заключаюцца ў тым, што мы амаль нічога не зрабілі ў справе ліквідацыі ўраўнілаўкі ў зарплаце. У гэтай справе мы і зараз маем нецярпімае становішча. Напрыклад, чорнарабочы на будаўніцтве атрымлівае ў дзень 4 руб. 16 кап., у той час, калі цесьляр зьдзельна атрымлівае 3 руб. 36 кап. На заводзе імя Варашылава токар атрымлівае аднолькавую стаўку з фармоўшчыкамі. На заводзе «Камунар» бляшаньнік 5-6 разраду атрымлівае ў месяц 350-400 руб., у той час, калі токар гэтага-ж разраду выпрацоўвае толькі 120-150 руб. Бляшаньнік 2-3 разраду мае ў месяц 250-300 руб., а токар таго-ж разраду — 60-80 руб. І вось для зьнішчэньня гэтага недапушчальнага зьявішча, для ліквідацыі ўраўнілаўкі нашымі партыйнымі, прафсаюзнымі і гаспадарчымі арганізацыямі зроблена і робіцца вельмі і вельмі мала. Такое становішча далей ні ў якім разе нецярпіма.

Забясьпечыць паляпшэньне бытавых умоў рабочых

Мы ў Менску вызначылі на буйнейшых прадпрыемствах пабудаваць 4 сталоўкі і фабрыку-кухню. Гэта фабрыка-кухня будуецца ўжо з гады. Але зроблена работ прыкладна на 25-30 проц. У сталоўку, якая будуецца на Ляхаўцы, укладзена прыкладна 25 тыс. руб. Гэта сталоўка ў гэтым годзе ня будзе скончана, бо не забясьпечана будаўнічымі матар'яламі і ня ўключана ва ўдарнае будаўніцтва. Таксама сталоўка на фабрыцы «Кастрычнік», якая выведзена ўжо пад дах, ня будзе скончана ў гэтым годзе з прычыны няўключэньня яе ва ўдарнае будаўніцтва. Работы па пабудове сталоўкі на заводзе «Дрэваапрацоўшчык» выкананы прыкладна на 50 проц. і на заводзе «Камунар» на 75 проц. З такімі марудным тэмпамі будаўніцтва мірыцца мы ня можам. ЦК УсеКП(б) у сваёй пастанове аб паляпшэньні грамадзкага харчаваньня будаўніцтва фабрык-кухань прыраўнівае да ўдарнай будоўлі прамысловасьці. У пастанове сказана, «абавязаць ВСНГ СССР забясьпечыць будаўніцтва будаўнічымі матар'яламі і абстаяльваньнем». На падставе гэтай дырэктывы мы павінны дамагацца, каб будаўніцтва сталовак, якое пачата ў Менску ў гэтым годзе, ва што-б тым ні стала было скончана, інакш мы ня ліквідуем дзякучасьці рабочай сілы.

Гарадзкую гаспадарку—на вышэйшую ступень

Наступнае важнае пытаньне—гэта становішча гарадзкой гаспадаркі і тыя мерапрыемствы, якія мы павінны правесьці. Гарком на красавіцкім пленуме паставіў цэлы рад практычных задач, якія забясьпечваюць паляпшэньне становішча гарадзкой гаспадаркі. Трэба адзначыць, што будаўніцтва гарадзкой гаспадаркі на многа адстае ад агульных тэмпаў сацыялістычнага будаўніцтва і не адпавядае тым узросшым запатрэбаваньням, якія нам прад'яўляюцца.

Жыльлёвы фонд у Менску па цэлым радзе жактаў знаходзіцца ў вельмі нездавальняючым становішчы. Прывядзеньне ў належны парадак жыльлёвага фонду наша важнейшая задача. Над выкананьнем гэтай задачы мы змагаемся і далей павінны змагацца з тым, каб зрабіць карэнны пералом у пытаньні жыльлёвага будаўніцтва гор. Менску. Разбуйненьне жактаў і прымацаваньне іх да прадпрыемстваў павінна палепшыць гэтую справу. Рабочы кантроль над жактамі, партыйны ўплыў дасьць нам магчымасьць больш наблізіцца да выпраўленьня тых недахопаў, якія ёсьць у жыльлёвай гаспадарцы.

Мы паставілі перад сабой задачу пабудаваць у гэтым годзе ня менш 800 кватэр. Гэта дырэктыва гаркому знаходзіцца пад пагрозай зрыву. Зараз, пры пераглядзе аб'ектаў першачарговага будаўніцтва, спынілася забясьпячэньне жыльлёвага будаўніцтва піламатар'яламі і інш. Мы павінны павесьці самую рашучую барацьбу каб не дапусьціць спыненьня будаўніцтва гэтых 800 кватэр. Трэба адзначыць, што ў адносінах да Менску ў некаторых галіновых цэнтральных арганізацый і асабліва ў Дзяржпляне існуюць ураўнілаўскія адносіны. Гэта ўраўнілаўка заключаецца ў тым, што дэфіцытныя будаўнічыя матар'ялы разьмяркоўваюцца ўсім раёнам па трошку. Выходзіць, што ўсе атрымалі па троху і будаўніцтва распачаць ніхто ні можа. Такія ўраўнілаўскія тэндэнцыі да Менску, як да сталіцы павінны быць вытручаны з цэлага раду нашых цэнтральных арганізацый, інакш мы з пытаньнем будаўніцтва, асабліва жыльлёвага ў г. Менску ня справімся. У першую чаргу трэба задаволіць Менск, а потым астатнія гарады.

Дырэктывы ЦК УсеКП(б) аб перабудове работы каапэрацыі ў нас выконваюцца слаба. Вельмі яшчэ мала практычна зроблена ў гэтай справе, каб на аснове перабудовы работы каапэрацыі палепшыць рабочае забесьпячэньне. Мы мелі выпадкі, калі нашы паасобныя кіраўнікі каапэрацыі ўсю справу перабудовы работы зводзілі галоўным чынам, да адкрыцьця новых магазынаў, не зважаючы належнай увагі на паляпшэньне рабочага забесьпячэньня. На падставе пастановы бюро гаркому трэба было адкрыць 90 новых магазынаў. Мы з гэтай задачай справіліся, але, на жаль, гэтыя магазыны яшчэ не пачалі як сьлед гандляваць, а частка з іх толькі раманцуецца. Гэту справу трэба паскорыць, каб новыя магазыны пачалі хутчэй гандляваць, хутчэй былі ўцягнуты ў работу на абслугоўваньні рабочых. Работу ЗРК мы дакладна праверылі і прыйшлі да высновы, што арганізацыя ЗРК цалкам і поўнасьцю сабе апраўдала. На тых прадпрыемствах, дзе арганізаваны ЗРК, палепшылася справа рабочага забесьпячэньня, некалькі палепшылася харчаваньне. Заслухаўшы на бюро гаркому даклады аб рабоце ЗРК мы парашылі іх сетку пашырыць з такім разьлікам, каб там, дзе ёсьць ня менш 1.000 рабочых, быў арганізаваны ЗРК.

Узначаліць рабочую актыўнасьць

Вынікі сацыялістычнага будаўніцтва за апошнія паўтары-два гады з усёй наглядзнасьцю паказалі рост актыўнасьці і творчага энтузіязму рабочых мас. Аднак, побач з агульным ростам сацспаборніцтва і ўдарніцтва, побач з яго далейшым паглыбленьнем, разгортваньнем новых форм, як выторчыя манаўры, пляцнава-апэрацыйныя групы, грамадзкі буксір, сустрэчныя планы і інш., мы маем яшчэ на цэлым радзе прадпрыемстваў невыстарчальны ахоп рабочых ударніцтвам. Калі на некаторых прадпрыемствах ахоплена ударніцтвам 80-90 рабочых, дык на такіх прадпрыемствах, як завод імя Варашылава мы маем толькі 52 проц. ударнікаў, на Эльводзе — 52 проц., на «Камунарцы» — 50 проц. і г. д. Ва ўдарную работу зусім слаба ўцягваюцца новыя пласты рабочых, якія ўліваюцца ў нашу прамысловасьць. Такое становішча тлумачыцца невыстарчальнай работай раду вытворчых партыйных ячэек і калектываў, каб узначаліць актыўнасьць рабочых мас. Мы павінны паставіць ва ўсю шырыню задачу пагалоўнага ахопу сацспаборніцтвам і ўдарніцтвам усіх рабочых нашых прадпрыемстваў, а тым больш на буйнейшых прадпрыемствах, як завод імя Варашылава і інш.

Шпаркі рост сацыялістычнай індустрыі патрабуе вялікай колькасьці рабочай сілы і іх кваліфікацыі. Таму лёзунг партыі аўладаць тэхнікай зьяўляецца баявым лёзунгам дня. У адпаведнасьці з пастановай ЦК УсеКП(б) аб тэхнічнай прапагандзе, мы высунулі задачы перад інжынэрна-тэхнічнымі сіламі — неадкладна і шчыльна падыйсьці да справы аўладаньня рабочымі тэхнікай вытворчасьці. Гэта задача стаіць перад нашай партыйнай арганізацыяй ва ўсёй шырыні.

Гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў—важнейшая задача арганізацыі

Пытаньне сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі ў рабоце гаркому займала і займае адно з важнейшых месц. У рэзультаце ўпартай барацьбы ўсёй нашай арганізацыі за рэканструкцыю сельскай гаспадаркі мы дабіліся значных посьпехаў у гэтай справе. Лютаўскі Пленум гаркому КП(б)Б паставіў задачу давесьці процант калектывізацыі прыгараднага раёну за час веснавой сяўбы да 60 проц. і да канца асеньняй—да 70 проц. Мы з гэтай задачай справіліся ня кепска. За час веснавой сяўбы калектывізацыя ў нашым раёне даведзена да 69,9 проц. Праўда, зараз процант калектывізацыі ў нас зьнізіўся да 65,7 проц. Гэта пагаршэньне тлумачыцца тым, што да нашага прыгараднага раёну далучаны яшчэ з сельсаветы, у зьвязку з ліквідацыяй некаторых раёнаў і ў гэтых сельсаветах быў ніжкі процант калектывізацыі.

Важнейшай задачай перад Менскай гарадзкой партарганізацыяй зараз зьяўляецца гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў. Мы наближаемся зараз да завяршэньня ў асноўным сацыяльнай калектывізацыі, маем 65 з лішнім процантаў. Таму зараз рашаючым вядучым лёзунгам павінен быць лёзунг гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў, увядзеньня зьдзельшчыны, вучоту працы ў калгасах, адсеў чужых элемэнтаў, правільнай расстаноўкі сіл і г. д. На падставе гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў наша задача—ісьці наперад па шляху завяршэньня сацыяльнай калектывізацыі ў нашым раёне.

Веснавую сяўбу мы правялі ў асноўным з посьпехам. З уборкай азімых пасеваў справіліся, але з прычыны таго, што надвор'е было дрэннае, мы маем зацяжку з уборкай яравых. Таму зараз на ўборку яравых павінна быць зьвернута ўвага ўсёй нашай партарганізацыі. Пры наяўнасьці нашых партыйных сілам маем усе магчымасьці з гэтай задачай справіцца і ўсякая зацяжка павінна кваліфікавацца, як няўменьне па-бальшавіцку змагацца за тое, каб ня плошчы гэктару яравых не засталося нязубранымі. Гэта задача стаіць з усёй вострасьцю.

У пытаньні ўборкі ў радзе вясковых парт'ячэек і калгасаў мы назіраем некаторае дабрадушша. Нядаўна на сакратарыяце гаркому мы разглядалі пытаньне ўборкі азімых. Нам сказалі, што ў адным з калгасаў усё ўбрана. Але, калі пасьля гэтага мы паслалі туды сваіх таварышоў, дык аказалася, што наўбраны 470 гэкт. жыта і 150 гэкт. ячменю. Зразумела, што мы рашучы ўдарылі на гэтай справе зьнялі сакратара з работы за «очковтирательство» і мабілізавалі ўвагу калгасьнікаў. Аказалася, што толькі за 2 дні зматлі ўбраць каля 400 гэкт., у той час, калі за 10 дзён раней убралі ўсяго 200 гэкт.

Гэты факт гаворыць за тое, што дзе партыйныя арганізацыі правільна расставілі сілы, арганізавалі работу, мабілізавалі ўвагу калгасных мас, там паспяхова спраўляюцца з задачамі ўборчай кампаніі. Трэба паставіць справу так, каб уся партыйная арганізацыя адчувала, што ўборка яравых і асеньняй сяўба зьяўляюцца першачарговай задачай, на якую трэба пераключыцца па-бальшавіцку.

Наш раён па сваім напрамку зьяўляецца садова-гародным і малочным раёнам. Таму праблема жывёлагадоўлі павінна займаць цэнтральнае месца ў рабоце ўсіх нашых арганізацый. На жалем гэтым пытаньнем займаемся вельмі мала. Напрыклад, па саўгасах Белсанагтрэсту мы павінны мець рагатай жывёлы ў гэтым годзе 3.288 шт, а маем 1.893, або 58 проц.; па саўгасах Белкаапсаюзу замест 2.830 шт. маем 1.175. Гэта вялізарнейшы недахоп у нашай рабоце.

Будаўніцтва абораў і сьвінарнікаў у нашым раёне сарвана. Лічбы выкананьня гэтага будаўніцтва ганебныя. Вырашэньню кармавой праблемы мы аддаем вельмі мала ўвагі. Плян сіласаваньня ў раёне выканан толькі на 8,4 проц. Мы павінны ў сваіх пастановах абавязаць усю партыйную арганізацыю, каб за плян сіласаваньня ўзяцца штурмам, каб ва што-б там ні стала яго выканаць. Усякія спасыланьні на аб'ектыўныя прычыны мы будзем разглядаць, як праваапартуністычныя адносіны да справы.

Чорная і чырвоная самадапамога

Пасьля Парыжу — прышоў Лёндан, пасьля Рым, пасьля зноў Бэзэль — вынікі наогул таксама мізэрныя. Нямецкія міністры — Брунінг і Курціус разьяжджаюць па сталіцах дзяржаў, якія перамаглі ўсусьветнай вайне. Адбываецца канфэрэнцыя за канфэрэнцыяй. Высоўваюцца першы, другі, трэці «гуманітарны» плян Гувэра. Нямецкая буржуазная прэса (перш за ўсё ўрэдавая) і асабліва, яе верная сястрыца — сацыял-фашысцкая прэса кожны раз робіць «вялікія надзеі». А Вэрсальскія кайданы, а з імі становішча Нямеччыны асабліва цяпер у час глыбокага эканамічнага крызысу, робяцца што-раз цяжэйшымі. Амаль зусім няпрыкметна прашоў факт падпісаньня ў Лёндане ўмовы аб правядзеньні ў жыцьцё пляну Гувэра так рэклямаванага П-ім Інтэрнацыяналам адтэрмінаваньня на адзін год часткі юнгаўскіх выплат. Мараторый не зрабіў грунтоўнага ўплыву на становішча Нямеччыны. Нямецкая буржуазія з нэрвовым напружаньнем і чаканьнем глядзела на канфэрэнцыю французскіх амэрыканскіх і ангельскіх фінансавых каралёў у Базэлі чакаючы ад яе замены кароткатэрміновых крэдытаў доўгатэрміновымі, звароту ўзятых з Нямеччыны крэдытаў і новай пазыкі. Рэзультаты аказаліся, як заўсёды, мізэрнымі.

Камісія 10 банкіраў, пад кіраўніцтвам амэрыканскага дэлегата Вігінса, ні аднаго з гэтых дамаганьняў ня выканала. Замест гэтага, дае Нямеччыне такую «рэальную» дапамогу, як, напрыклад, «параду» заграніччным крэдыторам ня вывозіць больш на працягу наступнага паўгоду з Нямеччыны сваіх кароткатэрміновых крэдытаў, дый то толькі такіх, якія зьмяшчаюцца ў банках, а не ў прамысловасьці. Але і гэтая «парада» ў выпадку ажыцьцяўленьня мала дапамагла-б і яна ні да чаго не абавязвае, як іранічна зазначае прэса нямецкага капіталу. Яна ніякім чынам не стрымае замежных банкіраў вывозіць свае грошы пры далейшым абвастрэньні крызысу і ўнутранай сітуацыі Нямеччыны, або, калі, напрыклад, французкі імпэрыялізм захоча зноў «націснуць» на Нямеччыну. У дадатак, Бязільская камісія адхіліла дамаганьні Нямеччыны не спаганяць 739 млн. руб. даўгоў у нямецкай валюце. Гэта пастанова проста б'е па хісткіх падставах нямецкай валюты.

Такім чынам, пры ўсіх супярэчнасьцях паміж Францыяй, з аднаго боку, і Англіяй з ПАЗШ — з другога, усе яны разам зацісканць пятлю «дапамогі» на шыі паваленай Нямеччыне.

Таму паміма гэтай нібы «перадышкі» у выдаче замежных капіталаў з Нямеччыны, якую маем за апошнія тыдні, крызис у нямецкай банкаўскай сыстэме і прамысловасьці пагаблякецца з кожным днём. Дэфіцыт бюджэту адной толькі Прусіі ў 1931 г. раўняецца 350 млн. марак. Крах Данатбанку не закончыў, а адкрыў сарыю банкаўскіх банкрутстваў, 20 жніўня лопнуў вялікі банк Леймана ў Гальле, які існаваў больш чым 100 год, і які адыгрываў кіруючую ролю ў эканамічным жыцьці цэнтральнай Нямеччыны і фінансавай папяровым, кіруючую і машынабудаўнічую прамысловасьць.

За банкамі ідуць прамысловыя прадпрыемствы. З банкрутцвам будаўнічага крэдытовага таварыства ў Магдэбургу, наступнае крах малутнага акцыйнага таварыства будаўнічых прадпрыемстваў. Банкрутцва, паражае вялікім аўтамабілябудаўнічым фабрыкам «Оппель». Адна фабрыка за другой скарачае, або і зусім спыняе працу. Так, мэталюргічны канцэрн Мансфэльд прыступае да звальненьня 15.000 рабочых; магутны хэмічны трэст «І. Г. Фарбэн-індустрыя», замыкае свае капальні ў Нахтэрштадт, таксама закрываюць частку сваіх аддзелаў вялікія хэмічныя фабрыкі «Лейна - Вэрка». Фабрыкі швэйных машын у Кайзэрсбаўгэн звальняюць палову сваіх рабочых — 12.000 чалавек. У басэйне Рур не працуе 143 капальняў. Сёньня афіцыяльная статыстыка налічае каля 4.000.000 беспрацоўных, а колькасьць іх расьце з кожным днём. Эканамічная пэрспэктыва капіталістычнай Нямеччыны — і ня толькі Нямеччыны — робіцца што-раз больш панурай. Зусім цьвароза ацэніў гэту пэрспэктыву Брунінг, заяўляючы карэспандэнту «Дайлі Майль»: Надыходзячая зіма будзе ў Эўропе найцяжэйшай за апошнія 100 год. Наймацней гэта адаб'ецца на Нямеччыне. Трэба лічыцца з тым, што лічба беспрацоўных вырасьце ў Нямеччыне да 7.000.000...»

Сярод скаргаў на недахват замежных крэдытаў зьбіраецца нямецкая буржуазія да ратаваньня сваёй гаспадаркі і ўрадаў «уласнымі сродкамі» — г. зн. арганізаваным у найшырэйшых маштабах грабяжы працоўных мас далейшым пусканьнем крыві. Шляхам да гэтага зьяўляюцца ня толькі памянёныя ўжо масавыя звальненьні, але і далейшыя атакі на зарплату, на сацыяльнае забесьпячэньне, на жабрацкую д

Год выданьня—XV
№ 239 (4144)
Чацьвер 3 верасьня 1931
Цана нумара 5 кап.
выходзіць
БЕСЬПЕРАПЫННА

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК Мен. Гаркому Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

РЭДАКЦЫЯ І КАНТОРА
Менск, Савецкая, 63.
Тэлефоны:
рэдактар—1-27,—сакратар—10-74, партсэктар—13-80, прапысл.—13-80, сац. земл.—6-19, мясц. інфарм.—6-19, замест. інфарм.—6-19, начны рэдактар—6-12, міжгародняя інфармацыя—10-74, канторавыд.—7-81, адд. абвестак—7-31

ЗЬЕЗД РЭФАРМІСЦКІХ ЗДРАДНІКАЎ НЯМЕЧЧЫНЫ

Дэманстрацыя крызісу і разлажэньня

ФРАНКФУРТ НА МАЙНЕ, 31. Адкрыўся зьезд рэфармісцкіх прафсаюзаў Нямеччыны пры ўдзеле 300 дэлегатаў, якія амаль выключна складаліся з сакратароў раённых і мясцовых прафарганізацый. Мітынгі, якія адбыліся перад адкрыцьцём зьезду, і дэманстрацыі, арганізаваныя франкфурцкай раённай арганізацыяй прафсаюзаў, выявілі глыбокі крызіс, які перажываецца рэфармісцкімі прафсаюзамі ў выніку іх здрадніцкай палітыкі. У мітынгу прынялі ўдзел, ня гледзячы на забліжацыю ўсіх прыляглых да Франкфурту рэфармісцкіх арганізацый, усяго каля 6.000 чалавек, а ў дэманстрацыі — 4.500, ня гледзячы на тое, што ў раёне, дзе абдываецца кангрэс, рэфармісцкія прафсаюзы налічваюць 260 тыс. членаў, а ў адным толькі Франкфурце на Майне — каля 72 тыс. Рабочыя самога Франкфурту на Майне дэманстравалі свае адносіны да кангрэсу поўным байкотам мітынгу і дэманстрацыі.

Адкрыцьцё кангрэсу адбылося паводле рэфармісцкага цэрэманіялу. Пасьля музычных практыкаваньняў і кароткай уступнай прамовы, сакратар усенямецкага праўленьня рэфармісцкіх прафсаюзаў **Эгерт** разгарнуў праграму кангрэсу. Эгерт выступіў з абвінавачаньнем супроць грахоў «капіталістычнай сыстэмы, якая ўжо пастарэла», і заявіў, што кангрэс «павінен выкрыць вінаватых кіраўнікоў гаспадаркі», паводзіны якіх выклікалі катастрафічны крызіс. У якасьці асноўнага лёзунгу Эгерт высунуў вядомыя патрабаваньні рэфармістаў: «кіраўнікі капіталістычнай гаспадаркі і банкі павінны быць пастаўлены пад кантроль дзяржавы».

У далейшым Эгерт падкрэсьліў необходнасьць згоды з Францыяй для таго, каб атрымаць крэдыты, і, нарэшце, навін быў заявіць, што ён абвяргае «бальшавіцкі сацыялізм».

Пасьля Эгерта з прывітаньнем выступіў Шэвэнэль — новы сакратар Амстэрдамскага Інтэрнацыяналу прафсаюзаў. Шэвэнэль калісьці лічыўся «левым» сацыял-дэмакратам, але сваёй двурушніцкай палітыкай дабіўся паста сакратара ў Інтэрнацыянале. Шэвэнэль прабаваў у сваёй прамове прадставіць банкрутства сацыял-фашысцкіх урадаў у Нямеччыне і ў Англіі, як вынікі «канфлікту паміж нязначнай меншасьцю фінансістаў і кіраўнікоў капіталістычнай гаспадаркі і працоўнымі масамі».

З прывітаньнем выступіў таксама старшыня праўленьня рэфармісцкіх прафсаюзаў Аўстрыі. На пасяджэньні кангрэсу з прывітаньнем выступіў старшыня праўленьня нямецкіх рэфармісцкіх прафсэкцыянальных саюзаў Лейпарт, які пацяшаў сваіх слухачоў тым, што, дзякуючы рэфармісцкім прафсаюзам «становішча рабочае клясы Нямеччыны значна палепшылася за гэты два гады, якія прайшлі ад часу трэцяга кангрэсу нямецкіх прафсаюзаў». Але і Лейпарт павінен быў прызнаць, што «атрымліваецца ўражаньне, што ўвесь сьвет дзейнічае ў тым напрамку, каб рабочая кляса Нямеччыны зноў вярнулася да становішча поўнай адсутнасьці запатрабаваньняў».

Гаворачы аб гаспадарчым крызісе, Лейпарт заявіў, што «прафсаюзы знімаюць з сябе адказнасьць за сучаснае становішча». У поўнай згодзе з вядомым выступленьнем Тарнова на зьезьдзе сацыял-дэмакратычнай партыі ў Лейпцыгу, Лейпарт таксама заявіў, што задача рабочае клясы зьяўляецца знайсьці сродак для перамаганьня крызісу капіталістычнай гаспадаркі.

З вялікай прывітальнай прамовай выступіў на кангрэсе міністар працы Штэгервальд. Штэгервальд пачаў сваю прамову зваротам на адрасе прафбюракратаў, якія сабраліся, і заявіў: «Я цьвёрда ўпэўнен, што калі-б хто-небудзь з вас аказаўся на маім пасту, дык ён, з прычыны становішча Нямеччыны, ня мог-бы праводзіць ніякай іншай палітыкі, апрача тэй, якая праводзіцца мною».

Далей Штэгервальд спыніўся на пытаньні гаспадарчага крызісу і спробах яго перамаганьня. «Сучасны крызіс — самы глыбокі крызіс з часу напалеонаўскіх войнаў», — заявіў Штэгервальд. Міністар падкрэсьліў, што сацыяльная палітыка Нямеччыны перажывае зараз самы глыбокі крызіс за ўвесь час свайго існаваньня. «Вельмі сумнявальна, — сказаў Штэгервальд, ці магчыма будзе, ня гледзячы на самы рэзкі рэжым эканоміі, унікнуць у надыходзячую зіму павышэньня ўзносаў на страхаваньні ад беспрацоўя». Аднасамога Штэгервальд намякнуў **на неабходнасьць скарачэньня дапамог па беспрацоўі, а таксама замены грашовых дапамог арганізацыям грамадзкага харчаваньня для беспрацоўных.**

Спыняючыся на пытаньні аб прадастаўленьні работы беспрацоўным, Штэгервальд указаў, што заслугоўвае ўвагі пытаньне ўвядзеньня пераменных зьмен на заводах такім чынам, каб рабочыя данага заводу на некаторы час пакідалі сваё месца беспрацоўным. Гэта сыстэма зводзіцца да таго, што рабочыя данага заводу працуюць, напрыклад, 2 тыдні і потым робяць кожны фаз перапынак на 2 тыдні. На працягу гэтых апошніх 2-х тыдняў працуе другая зьмена з беспрацоўных.

Спыніўшыся на пытаньні трацэйскага разгляду працоўных канфліктаў, Штэгервальд указаў, што аб адмаўленьні ад дзяржаўнага ўмяшаньня ў працоўныя канфлікты шляхам трацэйскіх судоў ня можа быць і гутаркі, бо трацэйскі разгляд патрэбен для таго, каб не дапускаць забастовак.

Пасьля раду іншых прывітальных прамоў кангрэс выбраў прэзыдыум, у які ўвайшлі вядомыя праффбюракраты: **Лейпарт, Брандэс, Шуман.** (ТАСС).

Арсень Уладзімеравіч Канчэўскі

31-га жніўня на курорце ў Гепенджыку на Каўказе, купаючыся ў моры, утапіўся АРСЕНЬ УЛАДЗІМЕРАВІЧ КАНЧЭЎСКІ — актыўны член камуністычнай партыі Зах. Беларусі і член яе Цэнтральнага Камітэту. Сьмерць яго зьяўляецца вялікай стратай ня толькі для КПЗБ, але і для ўсяго рэвалюцыйнага руху Заходняй Беларусі.

А. В. Канчэўскі нарадзіўся ў 1901 г. у Вільні. Яшчэ будучы хлапчуком прымаў актыўны ўдзел у грамадзкім жыцьці Зах. Беларусі, якая апынулася пад ботам польскіх акупантаў. У 1922-23 г. А. В. Канчэўскі належаў і актыўна працаваў у радах «Беларускай рэвалюцыйнай арганізацыі», якая ў канцы 1923 г. пад уплывам А. В. Канчэўскага і іншых яе членаў перайшла ў камуністычную партыю. З гэтага часу тав. «Владэк» бесьперапынна, аж да самай сьмерці працаваў у радах КПЗБ. У чэрвені ў 1924 г. рэвалюцыйную дзейнасьць тав. «Владэка» выкрылі паліцэйскія сышчыкі і ён быў арыштаваны. Віленскі суд прысудзіў яго да 4 год катаргі, якую ён адбываў у Лукіскай, Вронкаўскай і Равіцкай турмах. Увосень 1928 г. тав. «Владэк», асядзеўшы, быў звольнен і адразу стаў на свой рэвалюцыйны месца. Прыехаўшы ў СССР павучыцца і падлячыцца, каб загартавацца для далейшай барацьбы, загінуў так неспадзявана, якраз у момант, калі бурна ўздымаецца рэвалюцыйная хваля, набліжаецца момант пераможнай рэвалюцыі ва ўсёй Польшчы.

У памяць барацьбіта-рэвалюцыянэра і прыяцеля схіляем на хвіліну нашы галовы над труной барацьбіта і пойдзем далей да новых баёў і перамог пад сьцягамі КПЗБ.

ГРУПА ТАВАРЫШОЎ.

ДАМО 9.000 РАБОЧЫХ ДАНБАСУ

у вярбоўку рабсілы ўцягнуць пралетарскую грамадзкасьць

У раёнах вярбоўкі стварыць камісіі садзейнасьці імя Данецкага пралетарыяту

Для прэміяваньня лепшых грамадзкіх вярбоўшчыкаў вызначана 9.000 р.

Прапановы нарады пры „Зьвязьдзе" па пытаньні аб арганізаваным наборы рабсілы для Данбасу

1. Нарада лічыць неабходным стварыць у раёнах камісіі садзейнасьці арганізаванаму набору рабсілы імя данецкага пралетарыяту.

2. У склад камісіі павінны ўваходзіць: інспэктар працы, прадстаўнік гаспадарчай арганізацыі. (Донвугаль, Донжылбуд, Укржылбуд), упаўнаважаны Наркамправы, прадстаўнік райкалгассаюзу, спажывецкай кааперацыі, райкому ЛКСМБ, райпрафсавету і рэдактар раённай газэты. Уся работа камісіі праходзіць пад старшынствам старшыні РВК і пры непасрэдным кіраўніцтве ўпаўнаважанага ЦК КП(б)Б.

3. У функцыі камісіі уваходзіць:

а) удзел у плянаваньні кантрольных лічбаў, вызначаных для раёнаў Наркамправы, паміж калгасамі і аднаасобнікамі і вызначэньні ўдзельнай вагі камсамольцаў;

б) удзел у заключэньні дагавораў з калгасамі і калгаснікамі;

в) увязка дзейнасьці ўсіх упаўнаважаных, якія прыяжджаюць у даны раён па гэтай справе, нагляд за работай вярбоўшчыкаў;

г) садзейнасьць правільнаму групаваньню адыходнікаў і накіраваньню іх да вызначаных пунктаў і выбару старэйшых гэтых груп і брыгад;

д) грамадзкі кантроль за забесьпячэньнем рабочых харчамі ў дарозе з боку кааперацыйных арганізацый, медапамогай, за прызначэньнем правадніковаў, забесьпячэньнем вагонаў;

е) разгортваньне сацспаборніцтва і ўдарніцтва ў справе заключэньня дагавораў і выдаленьне лішкаў рабочай сілы з калгасаў;

ж) разьвіцьцё сацспаборніцтва ў справе вярбоўкі самімі калгаснікамі адыходнікаў (з дазволам у такіх выпадкаў застацца яшчэ на два-тры дні), разьвіцьцё шэфства калгасаў над гаспадаркамі аднаасобнікаў, якія едуць у Данбас.

з) Удзел у разьмеркаваньні прэмій лепшым вярбоўшчыкам-калгаснікам і інш. грамадзкім работнікам за добрую і актыўную дапамогу ў вярбоўцы рабсілы для Данбасу.

4. Пры Наркамправы арганізуецца цэнтральная камісія садзейнасьці набору рабсілы імя Данецкага пралетарыяту ў складзе прадстаўнікоў Наркамправы (старшыня), ЦСПСВ, ЦК ЛКСМБ, Калгасцэнтру, Белкаапсаюзу, Наркам Аховы Здароўя, упаўнаважанага Наркамшляхоў Зносін, «Зьвязды», упаўнаважаных гаспадарчых арганізацый. Пасяджэньні гэтай камісіі ў верасьні адбываюцца праз кожныя 6 дзён.

5. Адзначаючы са здаваленьнем, што Наркамправа камандыравана ў раёны 30 чалавек у дапамогу вярбоўшчыкам, нарада лічыць неабходным, каб ЦК ЛКСМБ накіраваў у раёны ня менш 15 упаўнаважаных, а ЦСПСВ—ня менш 10 чал. за кошт гаспадарчых арганізацый Данбасу. Калгасцэнтр павінен неадкладна даць катэгарычныя ўказаньні сваім упаўнаважаным, якія выехалі ў раёны па іншых пытаньнях, пераключыцца на дапамогу вярбоўцы рабочай сілы і выяўленьні лішкаў рабочай сілы ў калгасах.

6. Арганізаваць рэйды ўдарных брыгад друку па праверцы ўсёй гэтай работы.

7. Усе арганізацыі, якія ўваходзяць у цэнтральную камісію садзейнасьці пры Наркамправы, павінны неадкладна даць сваім мясцовым арганізацыям указаньні аб задачах работы раённых камісій.

8. Гаспадарчыя арганізацыі Данбасу прадастаўляюць у распараджэньне кожнай раённай камісіі **прэміяльны фонд** у суме, адпаведнай кантрольным лічбам рабсілы (напрыклад, раён які павінен даць 200 чал., атрымлівае 200 руб., 300 чал.—300 руб.) для прэміяваньня інстытуту **грамадзкіх вярбоўшчыкаў.**

9. Нарада лічыць патрэбным арганізаваць пры Калгасцэнтры цэнтралізаваны прэміяльны фонд у суме 50.000 руб. для прэміяваньня лепшых калгасаў. Грошы ўносяць гаспадарчыя арганізацыі Данбасу ў залежнасьці ад вызначаных кантрольных лічбаў для кожнай.

10. Нарада лічыць неабходным, каб упаўнаважаны НКШЗ даў мясцом указаньне аб тым, каб забясьпечыць адыходнікаў для Данбасу білетамі і пасадкай.

Крывавая расправа польсікх пагранічнікаў над перабежчыкамі

Масавае ўцяканьне сялян пад грэдам куль з акупаванай Зах. Беларусі ў Савецкі Саюз выклікала новую хвалю рэпрэсій фашысцкай улады над працоўнымі ўсёй прымежнай паласы і над сем'ямі перабежчыкаў. Віленская фашысцкая прэса і прэса беларускіх нацыянал-фашыстаў, піша амаль кожны дзень аб масавых аблавах і арыштах адначасова на ўсіх прымежных паветах. Манархічнае віленскае **«Слова»** ў адным з апошніх нумароў піша, што ў раёне Вілейкі і Паставы арыштавана 46 асоб. Асабліва зьдзекуюцца фашысцкія апрычнікі над сем'ямі перабежчыкаў. Фашысцкая прэса вуснамі дэфэнзывы патрабуе **ў корані «пресеч»** уцяканьне сялян з Зах. Беларусі ў СССР.

Паводле такога загаду фашысцкай улады польскія пагранічнікі жорстка распраўляюцца з уцякаючымі сялянамі. Пачынаючы з 23-га жніўня няма ні аднаго нумару фашысцкай прэсы, **дзе-б ня пісалася аб забойстве, або параненьні ўцякаючых сялян ў СССР.** Так, «Дзеньнік Віленскі» ў № 192 ад 23-га жніўня пісаў:

«З польска-савецкай граніцы дайшлі весткі аб новых крывавых падзеях у раёне Докшыц.

... У той час, калі групы ўцекачоў знаходзіліся недалёка ад пагранічных слупоў паміж вёскаю **Вітлянія** і засьценкам **Пагулянка,** іх заўважыў патруль польскай пагранварты. Патруль патрабаваў спыніцца, але сяляне пачалі шпарка ўцякаць праз граніцу. Копісты адкрылі агонь па ўцякаючых. Тут-жа, ля гранічных слупоў, два чалавекі ўпалі мёртвымі. На невялікай адлегласьці ад іх прышыты кулямі ўпаў трэці. Між іншым, ужо на савецкай тэрыторыі была забіта маладая дзяўчына. 7 чал. параненa. 9 сялян і 5 дзяўчын былі затрыманы. Іншым удалося ўцячы на тэрыторыю Саветаў. Забітымі аказаліся: **Кірыл Буко** з вёскі Мяноўшчына. Докшыцкай воласьці, **Ян Крывіч,** з вёскі Філёгорыя, Галубіцкай воласьці, **Міхась Пятух** з вёскі Цацэле, Глыбоцкай воласьці і **Зося Яцкевіч**—20 год з вёскі Вусалёўшчына, Пліскай воласьці».

Другая фашысцкая газэта **«Кур'ер Віленскі»** у № 195 ад 26-га жніўня падае: «Пэўнага дня раніцою ў раёне Даўгінава, недалёка ад маёнтку Ізаболіна патрулі польскай пагранварты заўважылі групу людзей, якія старалася прабрацца на савецкую тэрыторыю. На воклiч салдатаў «Стой»!—пачалі ўцякаць да савецкай граніцы. Копісты адкрылі агень. У результаце—забіт селянін **Паўлоўскі з жонкаю,** а 16-цігадовы хлапчук Пятрушкевіч затрыман.

У той-жа дзень раніцою на пагранічным вучастку ў раёне **Мільшэ** прабіралася другая група сялян у СССР. І тут салдаты адкрылі агонь па ўцякаючых, пры гэтым быў **цяжка паранен селянін Валуй,** Даўгінскай воласьці, і 7 чал. затрымана.

У гэтым самым нумары фашысцкая газэта падае аб надзвычайна трагічным, сьпісканючым сарца, выпадку. У часе абстрэлу групы перабежчыкаў на вучастку Мільшэ, адзін селянін **І. Кур'яновіч** быў цяжка паранен. Нікім не заўважаны, **аблізваючыся крывёю, некалькі соцень мэтраў поўз ён да савецкай граніцы. І вось у момант, калі ён дапоўз да гранічных слупоў, страціў прытомнасьць і тут-жа памёр.**

«Жыцьцё Навагрудзкае» ў № 205 ад 27-га жніўня паведамляе, што ў раёне вёскі Таргуны **па ўцякаючых сялянах быў адкрыт нават кулямётны агонь.** У рэзультаце тры чалавекі былі забіты на месцы, а каля 15—у тым ліку трое параненых — затрыманы. Іншыя разьбегліся».

Як відаць з усіх гэтых паведамленьняў буржуазнай польскай прэсы, фашысты, каб спыніць уцяканьне сялян з акупаванай Заходняй Беларусі ў Савецкі Саюз, ня спыняюцца ні перад чым, пускаючы ў ход нават кулямёты.

***

Чытаючы ўсе гэтыя паведамленьні беларускай прэсы аб крывавых расправах як над перабежчыкамі на самой граніцы, так і над сялянствам, што засталося на месцы, ствараецца нейкае дзіўнае ўражаньне. Працоўным масам, якім пад апекай паноў і паліцыі жывецца вельмі добра, раптам захацелася ў СССР, дзе пануе «прымусовая праца», дзе панує «голад» і «тэрор» і інш. жахі. Працоўныя Зах. Беларусі, якія карыстаюцца усімі выгодам. заходняй «цывілізацыі», дзе пануе «свабода», раптам захацелі быць «рабамі» і амаль не ў найдалнах працаваць у бальшавікоў. Неяк дзіўна робіцца ад усіх такіх паведамленьняў. Усе гэтыя факты неяк супярэчаць здароваму розуму. Яны сьведчаць аб тым, што напэўна выйшлі з-пад пяра хворага або звар'яцелага чалавека. Нас ня дзівіць такое вар'яцтва фашысцкіх пісак. Ёсьць чаго вар'яцець, калі ПРАШЫТЫ ТРЫМА КУЛЯМІ СЕЛЯНІН НЕКАЛЬКІ СОЦЕНЬ МЭТРАЎ, АБЛІВАЮЧЫСЯ КРЫВЁЮ, ПАЎЗЕ ДА САВЕЦКАЙ ГРАНІЦЫ, КАБ ЛЯ ГРАНІЧНЫХ СЛУПОЎ ПАМЕРЦІ.

С. Ж.

Барацьба супроць фашысцкай акупацыі ўзмацняецца

ВАРШАВА, 2. Як паведамляе фашысцкі афіцыёз **«Газэта польска»,** за апошнія часы ў Заходняй Украіне **зноў узмацнілася рэвалюцыйная барацьба супроць фашысцкай акупацыі. Штодня павялічваецца колькасьць актаў сабатажу.**

Так, 31 жніўня на шашы паміж **Драгабычам і Барыславам нехта перарэзаў тэлефоныя правады і зваліў 6 слупоў.**

У гэтых-ж самы дзень на чыгуначным палатне паміж **Улядзімер-Валынскам і Львовам** невядомымі асобамі пакладзена некалькі бярвеньняў. Каля **Печанежына** ва Львоўскім ваяводзтве зроблен напад на паштовую карэту, якая была літаральна засыпана стрэламі. **У выніку страляніны забіты і паранены 3 асобы.**

У сувязі з гэтымі актамі сабатажу ва Львове і ваколіцах ахранка **правяла шматлікія арышты.**

Замест працы—паўгода турмы

ВАРШАВА, 2. У акруговым судзе ў Востраве адбылася справа супроць **34 беспрацоўных,** якія былі **арыштаваны ў Кратошыне ў часе хваляваньняў у маі месяцы.**

22 мая перад ратушам у Кротошыне сабраўся натоўп беспрацоўных у **колькасьці 600 чалавек, якія патрабавалі працы або дапамогі. Атрымаўшы адмаўленьне, галодныя беспрацоўныя накінуліся на харчовыя крамы і рэстараны і пачалі іх руйнаваць. Выкліканая паліцыя жорстка расправілася з беспрацоўнымі. Некалькі дэманстрантаў было паранена.**

На судзе выступала звыш 25 чалавек паліцэйскіх і шпікоў, якія даводзілі, што ўсе арыштаваныя прымалі ўдзел у якасьці застрэльшчыкаў. Заслухаўшы сьведак, фашысцкі суд **прысудзіў усіх абвінавачаных да 6 месяцаў турмы кожнага.**

У Лодзі 36.000 бяздомных

ВАРШАВА, 2. Паводле даных біржы працы, лічба беспрацоўных у Варшаве па 22 жніўня **складала 20 тыс. асоб,** з якіх **4.750 працаўнікоў разумовых.** У параўнаньні з мінулым тыднем лічба беспрацоўных **павялічылася на 540 асоб.** Дапамогу па беспрацоўі з усяго гэтага ліку **атрымлівала толькі 4.518 чалавек.**

Як паведамляе фашысцкая **«Газэта Варшаўска»,** лічба бяздомных у Лодзі **перавышае 35 тыс. чалавек.** Начуюць яны ў парках, пад мастамі і г. д.

ПАЛАЖЭНЬНЕ АБ АРГАНІЗАЦЫІ ПРАЦЫ І ЎНУТРАНЫМ РАСПАРАДКУ

НА СЬВІНАГАДОЎЧЫХ ТАВАРНЫХ КАЛГАСНЫХ ФЭРМАХ*)

АБАВЯЗКІ СЬВІНАРА ПА ДОГЛЯДЗЕ ДАРОСЛЫХ СЬВІНЕЙ І ПАДСЬВІНКАЎ

1. Сьвінар адказвае за сваю групу сьвіней, падсьвінкаў і парасят (адносна догляду, кармленьня і захаваньня прыплода).

2. Дача кармоў сьвіньням і паеньне пасьля кожнага кармленьня, робіцца па ўстаноўленых ст. сьвінаром або загадчыкам фэрмы нормах і ў пэўны час. Ніякіх зьмен ў кармох і паеньні самастойна сьвінары ня робяць.

3. Пасьля кармленьня сьвінар абавязан добра вычышчаць кармушкі і два разы ў тыдзень мыць іх гарачай вадой са шчолакам, каб унікнуць захворваньня.

4. Сьвінар, пад кіраўніцтвам ст. сьвінара або заг. фэрмы, абавязан рабіць адзін раз у тыдзень узважваньне з такім разьлікам, каб за дэкаду былі ўзважаны ўсе даручаныя яму сьвіньні, і захоўваць чарговасьць узважваньня сьвіней.

5. Пры захворваньні сьвіней абавязан паведамляць старшаму сьвінару-брыгадзіру, або заг. фэрмы, каб прыняць меры да захварэўшых сьвіней.

6. У выпадку необходнага лячэньня той або іншай сьвіньні, сьвінар абавязан даглядаць яе згодна ўказаньняў доктара калі захварэўшая сьвіньня па характары хваробы застаецца на сваім месцы і не пераводзіцца ў ізалятар.

7. Сьвінар павінен сачыць за сьвіньнямі, каб не прапусьціць час злучкі і своячасова паведаміць аб гэтым старэйшаму сьвінару-брыгадзіру ці загадчыку фэрмы, каб своячасова правесьці злучку.

8. Абавязан не дапускаць выпадковых злучак маладняка і ў выпадку ўпушчэньня штрафуецца зьніжэньнем прадпадзён, паводле ўстаноўленага на фэрме ў правілах унутранога распарадку, разьмеры.

9. У зімовы час два разы ў тыдзень сьвінар абавязан рабіць шчоткай або мачалкаю, скрабаньнем або абціраньнем чыстку сьвіней, а ў летні час — мойку вадою, або дэзынфэктуючай вадкасьцю, паводле ўказаньня брыгадзіра.

10. Не радзей, як адзін раз у месяц, сьвінар абавязан рабіць дэзынфэкцыю і пабелку даручаных яму памяшканьняў.

АБАВЯЗКІ СЬВІНАРА ПА ДОГЛЯДЗЕ ПАРОСНАЙ МАТКІ

Акрамя ўсіх правіл догляду за непароснай сьвіньнай необходна наступнае:

1. Трэба берагчы паросную матку ад удараў і штуршкоў. Ля станкоў, дзе знаходзяцца паросныя маткі, павінны быць вывешаны плякаты, якія-б папярэджвалі аб асьцярожных адносінах з паросныма маткамі.

2. За тры тыдні да апаросу матку ня трэба ганяць на далёкую пашу, але необходна рабіць штодзённыя выпасы і прагулкі, каб унікнуць атлушчэньня.

3. Дзён за два да апаросу матку лепш не выпускаць са стойла (станок трэба вычысьціць і яшчэ лепш прадэзынфэкціраваць).

4. Подсьціл трэба мяняць кожны дзень і даваць яго у выстарчальнай колькасьці.

5. Пакідаць матку без нагляду ня трэба.

6. Паіць матку пасьля апаросу трэба цёплай (хатняя тэмпэратура), і чыстай вадой, не даваць мёрзлую бульбу ці папсаваныя прадукты.

7. Уборка подсьцілу пасьля апаросу сьвіньні абавязкова.

8. Пасьля апаросу сьвіньні парасят усіх зьбіраюць, адрэзаюць у іх пупавіну на 3-4 пальцы ад жывата, абціраюць сухой саломай і паклаўшы ў скрыню на мяккую салому, пакрываюць чым-небудзь цёплым і выносяць з сьвінарніка.

АБАВЯЗКІ СЬВІНАРА ПА ДОГЛЯДЗЕ ПАРАСЯТ

1. Кожны сьвінар па доглядзе парасят адказвае за кармленьне, догляд і захаваньне даручанага яму прыплоду.

2. Падпускаць парасят да сьвіньні, якая толькі апарасілася, трэба не раней, чым праз дзьве гадзіны пасьля сканчэньня апаросу.

3. Прадастаўляць у першыя 5-7 дзён больш слабым парасятам пярэднія, больш багатыя малаком саскі (кожны парасёнак потым прывыкне да свайго саска).

4. На працягу 5-7 дзён пасьля нараджэньня, пакуль парасяты слабыя і неаваротлівыя, необходна іх пасьля кармленьня адбіраць ад маткі, інакш сьвіньня іх можа задушыць.

5. Падпускаць да маткі для сасаньня парасят трэба 4-5 раз у суткі.

6. Пры вялікай колькасьці парасят ад аднаго апаросу ня трэба ўсіх парасят пакідаць пад аднэй маткай, а трэба разьмеркаваць паміж некалькімі маткамі, якія амаль адначасова апарасіліся, пакінуўшы за маткай, што апарасілася, ня больш 10 парасят.

7. Усіх парасят, пераданых другой матцы, у якой мала парасят, разам з яе ўласнымі трэба намазаць чым-небудзь пахучым (красам, слабым растворам крэаліну, газы), каб сьвіньні не адрозьнівалі сваіх парасят ад іншых.

8. Сьвіньню, якая апарасілася, трэба карміць добра, але паводле нормы.

9. Першыя два тыдні парасяты кормяцца толькі малаком маткі; на штучным выпойваньні малако падагріваецца.

10. Найлепшай заменай малака маткі парасятам з 4-тыднёвага ўзросту будзе наступная мешаніна:

1 частка ячменю, 1 частка аўса і 1 частка вікі ці гароху (усё ў раздробленым выглядзе).

На дзень гэтага корму трэба даваць 1/17, г. зн. 6 проц. жывой вагі парасяці, 5 дач у дзень, замешваць корм вадою або малаком.

11. Кармленьне маленькіх парасят павінна ісьці ў асобным падкормачным аддзяленьні, адгароджаным ад памяшканьня маткі (каб унікнуць паяданьня парасячага корму сьвіньнёй).

12. Необходна сачыць за тым, каб парасяты зьядалі корм.

13. Пасьля кармленьня пільна вычышчаць кармушкі і мыць іх вадою пасьля кожнай дачы корму (рэшткі недаедзеных кармоў зносіць у адно пэўнае месца для выкарыстаньня дарослымі сьвіньнямі).

14. Адзін раз у пяцідзеньку ўсе кармушкі павінны быць вымыты гарачай вадою са шчолакам, каб унікнуць захворваньня маладняка.

15. Зьмяняць нормы кармоў і пойла парасятам самавольна сьвінар без загадчыка фэрмы, або старэйшага сьвінара, ня можа.

16. У падкормачным аддзяленьні заўсёды павінны быць драўнінны вугаль, крэйда, яшчыкі з пяском каб у ім маглі рыцца парасяты. Необходна захоўваць чыстату кармушак, падлогі.

17. Пры замене парасятам зялёнага корму сенам, трэба апошняе абварваць гарачай вадой.

18. Даваць парасятам вельмі гарачы корм не рэкамэндуецца.

19. Пабоі парасят катэгарычна забараняюцца і ў выпадку выкрыцьця гэтага вінаватыя калгаснікі павінны быць неадкладна зьняты з работы.

20. У летні час необходна мыцьцё парасят адзін раз у тыдзень.

21. У добрае надвор'е маленькім парасятам прагулка необходна.

22. Нельга дапускаць, каб мача застойвалася на падлозе сьвінарніку, каб унікнуць паглынаньня яе парасятамі і захворваньня іх паносам.

23. Чыстка гною і дача подсьцілу ў сьвінарніку павінны быць штодзенна. У зімовы час подсьціл павялічваецца.

24. Пры зьяўленьні паносу ў парасят необходна зрабіць дэзынфэкцыю памяшканьняў: памыць падлогу і кармушкі гарачай вадою са шчолакам, або пасыпаць падлогу вапнаю, ці змачыць растворам крэаліну (на адну бутэльку дзьве лыжкі крэаліну), сьцены і падлогу.

Можна рэкамэндаваць наступны сродак: саскі ў маткі, якая корміць, змачыць 2 проц. растворам крэаліну. Парасяты разам з малаком маткі захопяць і крэалін.

25. У выпадку якога-б там ні было захворваньня ў парасят ці ўзьнікненьня яўнай эпізоатыі, необходна патрабаваць прыбыцьця ветдактара, каб прыняць своячасова необходныя меры. У крайнім выпадку неадкладна выклікаць фэльчара.

АБАВЯЗКІ ПАСТУХА

1. Выпускае ў вызначаны час сьвіней на пашу, заганяе назад на месца стаянкі.

2. Сочыць за роўнамерным акармліваньнем травы і пашы.

3. Ва ўстаноўлены зоатэхнікам час гоніць для паеньня да рэчкі ці ў іншае абумоўленае месца.

4. У сопечную сьпякоту заганяе жывёлу пад навесі ці ў прахладныя месцы.

5. Адзначае матак, якія патрабуюць кныра і паведамляе аб гэтым брыгадзіру.

6. Паведамляе неадкладна тэхнікусьвінавоу, ці брыгадзіру аб захварэўшай жывёле.

7. Пры пасьбе катагарычна забараняецца біць сьвіней і хутка ганяць, асабліва культгаючых і слабых. Асобная адказнасьць ускладаецца на пастуха за стан паросных матак. Ён абавязан увесь час сачыць за тым, каб іншыя сьвіньні ня штурхалі паросных матак і не дапускаць боек паміж сьвіньнямі.

(Працяг будзе)

*) Працяг — пачатак глядзі ў №№ 235 і 236.

Адказны рэдактар С. БУДЗІНСКІ.

Кіно «ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА»
ДЗЕННЫЯ СЭАНСЫ
Чацьвер, 5 верасьня
САДЗЕЙНАЯ ПРАГРАМА
2 карціны ў адзін сэанс
1) КАЎКАСКІ НЯВОЛЬНІК паводле Лермантава.
2) ПОШТА ГУКАВЫ ФІЛЬМ
ПАЧАТАК сэансаў: 1 у 1 гадз., 2—2 гадз, 30 м.
КАСА—ад 12 гадз.
Цэны значна зьменшаны.
Дзеці да 10 год праходзяць пры дарослых, або 2 дзяцей на адзін білет.

З 5 верасьня
кіно „Інтэрнацыянал"
працуе З 12 ГАДЗ. ДНЯ
бесьперапынна
Пачатак 1-га дзеннага сэансу ў 2 гадз., 2-га—у 3 г. 30 м.
Пачатак вечэрніх сэансаў у 7, 8—40 і 10-30.
КАСА АДКРЫТА
штодзенна ад 12 гадз. дня.
ЦЭНЫ на дзенныя сэансы ЗНІЖАНЫ

3-га верасьня, у 7 гадзін вечара, у Доме Камасьветы адбудзецца
вечар „За ленінскую вучобу",
прысьвечаны пачатку навучальнага году ў сетцы партасьветы.
Сакратаром партколектыву забясьпечыць поўную яўку. Білеты атрымаць у Гаркоме КП(б)Б.
МЕНГАРКОМ КП(б)Б.

„Чырвоная Зорка" ШПАРКАСЬЦЬ І НАЦІСК камэдыя ў 8 частках. ЗВЫШ ПРАГРАМЫ: ТРЫМАЙ ЗЛОДЗЕЯ.
„КУЛЬТУРА" Пач. у 7; 8-45; 10-30 Новы выдатны мастацкі бытавы фільм 2 МАТКІ 2 драма ў 6 частках.
„Інтэрнацыянал" Пач. 1 с. у 7 г. в. МАСТАЦКІ ФІЛЬМ ПАЎНОЧНАЕ КАХАНЬНЕ драма ў 7 частк. Звыш праг. кіно-часоп. БДК № 14.
„Пралетары" Адкрыта з 12 г. дня Мастацкі фільм з жыцьця вучонага і паэты ЛАМАНОСАВА СЫН РЫБАКА.
„Юны Піянэр" (будынак кіно „Культура") Эпізод з грамадзянскай вайны ШАСНАЦЦАТЫ Пачатак сэансаў з 1 гадз.
„СПАРТАК" Пач. 6-30, 8, 9-30 і 11 Каса—з 5 гадз. З 1 верасьня замежны баявік КАМІЛА Драма ў 6 частках.

БЕЛАРУСКАЕ ДЗЯРЖАЎНАЕ ВЫДАВЕЦТВА
з трэцяга па 15 верасьня
праводзіць
ПЕРАРЭГІСТРАЦЫЮ
ўсіх овіх перакладчыкаў
Пункт перарэгістрацыі—стыльрэдакцыя БДВ
Пасьля 15 верасьня, асобы, якія не перарэгіструюцца, пазбавяцца права на пераклады.
ПРАЎЛЕНЬНЕ БДВ.

УСЕ СТУДЭНТЫ
другога патоку Горацкай сельскагаспадарчай акадэміі,
ПЕРАВЕДЗЕНЫЯ Ў БЕЛАРУСКІ
маханіка-машына-будаўнічы інстытут
павінны ЗЬЯВІЦЦА на заняткі 10-га ВЕРАСЬНЯ г. г.
Дырэктар інстытуту ЛЫСОЎ.

АНОНСІ СКОРА!
Рыхтуецца да пастаноўкі
вялікі мастацкі фільм
паводле твораў М. ШОЛАХАВА
ЦІХІ ДОН
САЧЫЦЕ ЗА РЭКЛЯМАЙ!
АНОНСІ

Сэктар кадраў Белптушпрадукту
паведамляе, што АДКРЫТ ПРЫЁМ у:
1. ФЗВ пры Полацкім яйка-птушным камбінаце.
2. ФЗВ пры Жлобінскай яйка-птушнай фабрыцы.
Прыём праводзіцца на базе 7-годні ва ўзросьце ад 16 да 19 год. Правілы прыёму і падачы дакумантаў, як і ў іншых ФЗВ і навучальных установы.
ФЗВ рыхтуе ўніверсальных рабочых, спэцыялістаў па яйка-птушнай прамысловасьці, тэарэтычна падрыхтаваных для паступленьня ў ВНУ.
Тэрмін навучаньня 2 гады.
Прынятыя ў ФЗВ забясьп